

# Казкі Шчаслівага Дому

для дзяцей і дарослых

аўтар і ілюстратар
Вольга Верасень

Казкі Шчаслівага Дому
для дзяцей і дарослых

Беларуская мова

Падарунак
некамерцыйны праект
паводле друкаванай кнігі

«Казкі Шчаслівага Дому для дзяцей і дарослых»
ISBN: 978-0-9995779-0-5
(цвёрдая вокладка)
Выдавецтва Вольгі Верасень

аўтар і ілюстратар
Вольга Верасень

Тэкст Copyright © Вольга Верасень
Ілюстрацыі Copyright © Вольга Верасень

Усе правы ахоўваюцца.
Любая частка гэтай кнігі можа быць выкарыстана
любым спосабам толькі з пісьмовай згоды аўтара.
Кантакт: www.olgaverasen.com

*Пагайдаўся Ветрык*
*У полі на сцяблінках,*
*Пагуляў на тонкіх*
*Нітях-павуцінках.*
*Дакрануўся лёгка*
*Да аблокаў неба*
*Ціха запытаўся:*
*- Можа казку трэба?*

# Казкі
# Шчаслівага Дому

*Прысвячаецца дзецям і дарослым*

*ад Сэрца да Сэрца*

Ад аўтара ____ 6

Шчаслівы Дом ____ 9

Песня Званочка ____ 13

Кропля ____ 17

Маленькі Вожык ____ 21

Вусень і Прыгажосць ____ 25

Зайчыкава Мара ____ 31

Божая Кароўка і сем кропак ____ 35

Мядзведзік і Дождж ____ 41

Ружовы Кот ____ 47

Конік і Скрыпачка ____ 53

Рамонак і Любоў ____ 59

Маленькая Хмарка ____ 65

Рознакаляровы Свет ____ 69

Дзьмухавец ____ 75

Старая Яблыня ____ 81

Маленькая Сняжынка ____ 87

Дзень Нараджэння Лесу ____ 91

Шпак і Значнасць ____ 95

Неабыякавы Парсючок ____ 101

Курка і Залатое Яйка ____ 105

Певень і Гадзіннік ____ 111

Камень ____ 117

Апошні Лісцік і Вецер ____ 123

Блазан ____ 127

Нарадзілася ў Небе Зорка ____ 137

Свечка ____ 141

Папараць-Кветка ____ 143

Птушка і Край Неба ____ 147

Пасадзіла Жанчына Насенне ____ 151

Жыве на Свеце Шчасце ____ 155

Эпілог ____ 158

Адкуль з’явіліся казкі? З дзяцінства...

З цёплага маленькага ганка на якім сядзела побач з матуляй і глядзела на неба... З вандровак па лесе, дзе, здаецца, кожная сцяблінка, кветачка хоча паразмаўляць з табой... Адчуванне, што ўсё вакол жывое, – адтуль, з дзяцінства.

Мы больш разумеем сваіх бацькоў, напэўна, тады, калі самі становімся імі. З’яўляецца вялікі цуд: пасапвае ў калысцы пакуль маленькі чалавек, і ты адчуваеш, што для яго і цябе зноў адчыняецца вялікі Свет які мы спазнаём усё Жыцце...

Дзеці... Сярод іх няма падобных, нават калі растуць побач. Гэтак жа як і мы, дарослыя, непадобныя адзін да аднаго. Светлыя ўсмешкі, вочы – чысціня сэрца... Дзеці любяць казкі... Асабліва калі іх расказваюць. Вось гэтак з’явіліся і мае.

Раслі дзеці, разам з імі раслі казкі. Колькі год складаліся... Нарэшце некаторыя засталіся на паперы. Казкі для дзяцей і дарослых...

Хіба казкі патрэбныя толькі маленькім? Урэшце, усе мы – дзеці...

З любоўю Вольга Верасень

Што такое Жыццё?
Паветра...
Бязмежнасць...
Сем колераў на небе пасля дождджу.
Крыштальны крык жуaвоў,
Узнёсласць і вышыня,
Свабода і палёт...

Што такое Жыццё?
Вада...
Яна, як час, змяняе ўсё.
Нават тое, што здавалася непарушным.
Хвалі пачуццяў,
Глыбіня думак.
Усё цячэ і ўсё змяняецца...

Што такое Жыццё?
Зямля...
Зялёныя далоні лісця, яркія галоўкі кветак.
Прыгожыя промні Сонца...
Мы бегаем па ёй басанож.
Смяёмся і радуемся яе цеплыні,
Быццам дзеці...

Што такое Жыццё?
Любоў...
Агонь, што ніколі не згасае...
Яна саграваe сэрца,
Не дае знікнуць у ім Веры і Надзеі.
Яна – Прыгажосць і Радасць.
Яна – цуд, які ёсць у кожным...



# Шчаслівы Дом

Жыве на Свеце Дом з вялікімі вачамі-вокнамі...

Дом гэты шчаслівы. Чаму? Мабыць таму, што тыя, хто яго калісьці будаваў, глядзелі на Свет добрымі вачыма.

А яшчэ ў гэтым Доме жывуць Казкі... Так-так – Казкі!

Дом стаіць на ўзгорку, побач з ім луг, крыху далей, за возерам, пачынаецца лес. Дом разам з імі радуецца надыходу Вясны, усміхаецца Сонейку Летам, крыху сумуе Восенню, ціха дрэмле Зімой...

Казку ўбачыш там, дзе хораша...

У Шчаслівым Доме яны з'яўляюцца кожны вечар, а як толькі пачынаецца дзень, адлятаюць. Куды? Куды ім трэба. Якія ж яны, Казкі, прыгожыя! Ніводнай аднолькавай няма! Усе розныя: вялікія і малыя, вясёлыя і не вельмі.

Адкуль яны? Хто ведае? Дом не ведае таксама: з'яўляюцца – і ўсё. Прылятаюць, кружаць у Небе рознакаляровымі птушкамі. Толькі крылы зіхацяць...

Асцярожна апускаюцца на ганак. Стаміліся. Шчаслівы Дом сустракае іх ласкава, усміхаецца задумліва, прыгадваючы нешта сваё. Потым кладзе іх спаць, пяшчотна накрываючы мяккай коўдрай...

Дом стараецца, каб Казкам заўседы было цёпла і ўтульна. Шкадуе іх, прыслухоўваецца ўважліва: «Можа, што трэба?» Нават ноччу сваім скрыпам навучыўся страшыць маленькіх шэрых мышак. Яны апошнім часам зусім страцілі сорам, пэўна, здагадаліся, што тут Казкі добрыя жывуць! А яшчэ Дом заўсёды просіць зоркі і Хмарку, каб тыя прыносілі Казкам добрыя сны...

Казкі Дом шануюць. Прыносяць яму добрыя навіны Свету. Дом любіць іх слухаць. Нават Вецер у гэты час не спявае ў коміне свае песні, а слухае таксама.

Раніцай, як толькі з’яўляюцца першыя промні Сонейка, Шчаслівы Дом выпраўляе Казкі ў дарогу. Асцярожна адчыняе свае дзверы – і ў вышыню, адна за другой, ўздымаюцца Казкі.

Лёгка ўзмахваюць рознакаляровымі крыламі і знікаюць ў сіняве Неба... Шчаслівы Дом не ведае, куды яны ляцяць і калі вернуцца. Ён глядзіць у Неба вялікімі добрымі вачыма-вокнамі і чакае...

Шчаслівы Дом сустракае Казкі. На пачатку новага дня зноў выпраўляе іх у падарожжа. Ляцяць Казкі ў Свет! Ласкава і пяшчотна кранаюць крыламі сэрцы, падтрымліваючы святло Любві на Зямлі...





# Песня Званочка

«Дзі-дон! Дзі-дон!» – ціхенька спяваў Званочак...

Павучок паварушыў лапкамі і расплюшчыў вочкі.

Праз салодкі ранішні сон ён пачуў, як штосьці зусім побач праспявала: «Дзі-дон!» Потым, памаўчаўшы крыху, зноў: «Дзі-дон, дзі-дзі-дон!»

Звычайна ён прачынаўся значна пазней, таму і сёння зноў шчыльна скруціўся ў камячок, але праз некаторы час пачулася ўжо больш моцнае: «Дзі-дон-дон, дзі-дон-дон!»

Высунуўшыся з-пад скручанага лісціка, Павучок агледзеўся...

Яго ўласная маёмасць! За тонкія ніці павуцінак зачапіўся галоўкай Званочак і, гойдаючыся пад дыханнем Ветрыка, ціхенька спяваў пра нешта...

– Ты мяне разбудзіў! – незадаволена праціраючы лапкамі вочкі, сказаў Павучок.

– Прабач, калі ласка, я не ведаю, як гэта атрымалася, – засаромеўся ад гэткай непрыемнасці Званочак. – Прабач, калі ласка, і прывітанне!

– Прывітанне, прывітанне! – прабуркатаў Павучок і збіраўся ўжо залезці зноў у свой дамок, але ўсе ж такі спыніўся. – Можа... чым дапамагчы?

– Дапамажы, я табе вельмі ўдзячны буду!

Званочак захваляваўся і зазвінеў так гучна, што Павучок схапіўся лапкамі за галаву:

– Хопіць табе! І так ужо разбудзіў усіх, напэўна...

Паціху разматваючы павуцінку за павуцінкай, Павучок буркатаў:

– Вось і будуй, час губляй, каб потым усё тваё нехта за адну хвіліну сапсаваў...

Кропелькі расы віселі на павуцінках, быццам чароўныя ліхтарыкі, падараваныя промнямі Сонца. Некаторыя зрываліся і маленькімі бліскучымі пацеркамі падалі на Павучка.

Ён пачаў было зноў буркатаць, але ўбачыў вясёлыя вочы Званочка і... засмяяўся таксама. Смех падхапіў і забраў з сабою крыўду...

У празрыстым паветры то ўзнімаліся, то апускаліся ледзь бачныя пасмачкі павуцінак... Павучок скончыў працу, і Званочак нарэшце выпрастаў галоўку.

– Дзякуй табе! – сказаў ён, нахіліўся і раптам зноў пачулася: «Дзі-дон, дзі-дзі-дон...»

Званочак спрабаваў стрымацца – ды дзе там! Лёгкімі хвалямі несліся па наваколлі чароўныя гукі, лёгкім, вытанчаным рэхам абуджаючы ўсе жывое: «Дзі-дон! Дзі-дзі-дон!»

Патаёмнымі ноткамі звалі яны ўсё самае светлае і добрае, што ёсць на Свеце... Званочак зваў новы дзень: «Дзі-дзі-дон, дзі-дзі-дон!»

Гукі сціхлі... Павучок сядзеў, заплюшчыўшы вочкі. Ён слухаў! Потым казаў ціхенька:

– Дзякуй табе... А можна яшчэ?

– Можна...

На блакітным Небе ласкава ўсміхалася Сонца, а на Зямлю зноў і зноў звонкім струменьчыкам лілася мелодыя, ў якой блакітнымі званочкамі гучала Радасць...





# Кропля

Кропля вісела на танюткай сцяблінцы і падаць уніз не збіралася!

Дождж даўно ўжо прайшоў. Кропля прыгожа ўсміхалася Сонейку ўсімі вясёлкавымі колерамі і не падала! Уласны маленькі цяжар ей не перашкаджаў. Вісела ўжо доўгі час...

Яе сяброўкам гэта даўно надакучыла, і таму яны, паразмаўляўшы паміж сабою пра надвор'е, разам адляпіліся ад сцяблінкі і паляцелі ўніз, гучна павітаўшыся з лужынай: «Боўць!»

Кропля падаць уніз не хацела...

«Не хачу туды! Буду ўсміхацца пакуль сіл хопіць!» – вырашыла яна. Трымалася за самы ўскраек і ўсміхалася. Нават Вецер перастаў гойдаць сцяблінку, каб не перашкаджаць ёй. Кропля падзякавала яму за гэткую пяшчоту і ўбачыла... Смаўжа.

Марудна перасоўваючы свой дамок, Смоўж накіроўваўся менавіта ў яе бок. Сцяблінка была танюткая і лёгкая, а ён – тлусты і цяжкі.

– Прабачце, можа, Вам было б зручней пайсці па другой дарозе? – пачала было Кропля, але Смоўж яе не даслухаў:

– Не змагу, не зручна і... не хачу!

Ён упарта поўз наперад, негледзячы на тое, што ў любы момант мог зваліцца.

– Шкада, калі мы звалімся разам, – уздыхнула Кропля, што моцы трымаючыся за хістаючуюся сцяблінку.

– А мне да цябе справа? Я, калі звалюся, дык нічога – у мяне дамок моцны... І ўвогуле я піць хачу!

Смоўж, пыхкаючы, поўз наперад.

– Можа... Вы напіліся б там унізе? – ціха спытала Кропля, з жахам прыціскаючыся да шурпатых палосак сцяблінкі.

– Унізе?! Яшчэ чаго! Папаўзу я ўніз! Я ў гару хачу! Да таго ж ты гэткая празрыстая і, напэўна, смачная. Увогуле, навошта ты тут вісіш? Усе твае даўно ўжо там.

Смоўж выразна паглядзеў уніз і спытаўся:

– Ты што? Сонца не баішся?

Кропля ўсміхнулася:

– Навошта яго баяцца? Яно прыгожае, вясёлае... Бачыш, як гуляе са мной!

– Гуляе?! Зараз высушыць цябе – вось і пагуляе!

– Няхай. Я ўсе адно на Зямлю з дожджыкам вярнуся!

– Вярнуся, вярнуся... Хто цябе пазнае? Шмат вас такіх... Усе аднолькавыя.

Смоўж хацеў прамовіць яшчэ нешта, але не ўтрымаўся – і гучна пляснуўся ўніз. Там, крыху збянтэжаны ад нечаканасці, ён схаваўся ў свой дамок, але праз некаторы час высунуўся.

– Яшчэ не звалілася? – з’едліва спытаў ен. – Зусім маленькая зрабілася!..

– Не звалілася! – засмяялася Кропля і агледзелася...

Вільготная пасля дажджу зямля ўбірала ў сябе шчырае цяпло сонечных промняў. Усё, што бачыла Кропля, празрыстымі малюнкамі адбівалася на яе баках. Тое, што жыло і радавалася Сонцу, зіхацела ў ёй самой рознакаляровымі адценнямі, быццам чараўнік зрабіў цуд-скарбонку з крышталю і склаў туды ўсе свае багацці.

Кропля вісела доўга. Уладкавалася зручней і цяпер стомленасці не адчувала. Пакрыўджаны Смоўж ізноў схаваўся ў свой дамок, на развітанне доўга пыхкаючы аб дурноце некаторых асоб, якія вісяць без усялякага сэнсу.

– Глядзіце, дождж даўно скончыўся, а гэтая кропелька ўсе яшчэ вісіць! – пачуўся звонкі голас Матылька. – Якая прыгожая! Паглядзец – у ёй увесь Свет – чысты і празрысты... Шкада, калі ўпадзе...

– Асцярожна, не краніце яе! – крыкнуў Матылек Страказе, якая ледзь не зачапіла Кроплю сваімі крылцамі. – Няхай вісіць, наколькі сіл хопіць, – пяшчотна дадаў ён.

– Я не звалюся! У мяне сіл хопіць! – хацела адказаць Кропля, але адчула, што падымаецца ўсе вышэй і вышэй.

«Я вярнуся, абавязкова зноў вярнуся!» – гучала ціхім лёгкім шэптам зверху...





# Маленькі Вожык

Маленькі Вожык ніяк не мог зразумець, навошта яму калючкі...

Калючкі ён мацаў штодня і, пазіраючы на іх вострыя канцы, задаваў сабе ўсяго адно толькі пытанне: «Чаму яны на мне растуць?» Але адказу знайсці не мог.

Спытаць пра гэта ў бацькоў было неяк няёмка: яны, заўсёды заклапочаныя паўсядзённымі справамі, не мелі часу нават проста пасядзець побач. Але і маці, і тата маленькага Вожыка вельмі любілі, шкадавалі і, ласкава называючы Вожычкам, ганарыліся ім.

Так могуць ганарыцца толькі бацькі, радуючыся таму, як расце іх дзіцятка, бачачы менавіта ў ім здзяйсненне ўсіх сваіх мар. Напэўна, таму ў маленькага Вожыка  ніколі не знікала адчуванне надзейнай аховы, лёгкай, але ў той жа час, вялікай і моцнай.

Сам Вожык не мог даць ёй назву: проста ёсць – і ўсе. Ён проста ведаў, што ёсць на Свеце цёплы, ледзь пухнаты, матулін жывоцік, у які заўседы можна ўткнуцца вільготным носам, крыху пашморгаць ім, і тады ўсе складанае будзе здавацца не такім ужо і балючым...

Калі сёння Вожык ізноў незнарок драпнуў сам сябе ўласнымі калючкамі, ён канчаткова вырашыў разабрацца з тым, навошта яны, гэтыя калючкі, яму патрэбныя. «Пад Вялікай Елкай учора ўладкоўваў сваю хатку Разумны Янот...» – падумаў Вожык і, паспешліва перабіраючы кароценькімі лапкамі, накіраваўся туды.

Разумны Янот быў ужо вельмі стары і таму, стамляючыся, часта грэўся на Сонцы, падстаўляючы яго цяплу сівую морду з доўгай калматай поўсцю.

Янота нездарма называлі Разумным, бо, нягледзячы на старэчы выгляд, лепшай парады ў якіх бы то ні было жыццёвых абставінах акрамя яго, у Лесе не мог даць ніхто.

– Дзень добры! – тупаючы на месцы, ціхенька прамовіў Вожык і засаромеўся, убачыўшы, што Разумны Янот не спіць, а паблісківаючы вачыма, з усмешкай пазірае на яго.

– Добры, добры! – адказаў Янот і, не зацягваючы размову, адразу спытаў: – Чаго прыйшоў?

Вожык крыху разгубіўся:

– Наконт калючак я...

Стары Янот, узняўшы морду, здзіўлена хмыкнуў:

– Хіба табе іх не хапае?

– Не-не, я не аб тым, – заспяшаўся растлумачыць Вожык. – Дзядзька Янот, скажы, калі ласка, навошта яны мне?

Разумны Янот не чакаў гэткага пытання...

Ён доўга маўчаў, задумліва паглядаючы то на Вожыка, то на дрэвы, то на траву, а потым сказаў:

– Калі яшчэ жыла мая бабуля, я чуў ад яе, што даўным-даўно ў вас, вожыкаў, калючак не было.

– Не было? – здзівіўся Вожык, асцярожна кранаючы лапкай іх вострыя канцы.

– Не было! – пацвердзіў Янот.

– Навошта яны цяпер?

– Таму што цяпер ёсць іклы ды кіпцюры...

– Каму яны патрэбныя?

– Таму, хто іх мае...

– І табе таксама?

– Атрымліваецца, што так...

– А без іх абысціся нельга?

– Не ведаю, можа хто і спрабаваў...

– А ты?

Разумны Янот доўга маўчаў, а потым сіпата прамовіў:

– Я пра гэта неяк не задумваўся...

– Чаму? Ты ж самы разумны ў Лесе. Калі не ты, тады хто?

Простыя і ў той жа час складаныя, як сам Свет, пытанні маленькага Вожыка прымусілі старога Янота з вышыні пражытых гадоў паглядзець на самого сябе... І ён не знайшоў, што адказаць гэтаму маленькаму, сціпла шморгаючаму носам, калючаму камячку, які пакуль яшчэ не ведаў, навошта яму калючкі...

А маленькі Вожык, так і не дачакаўшыся адказу, ціхенька патупаў дамоў, ведаючы, што ёсць на Свеце цёплы, ледзь пухнаты матулін жывоцік. Магчыма, ён сёння зноў уткнецца носам у яго. Тады ўсё складанае стане простым, зразумелым і таму не такім балючым.

«А можа, – няспешліва перабіраючы лапкамі па лясной сцяжынцы, думаў Вожык, – я знайду адказ на пытанне сам?»...





# Вусень і Прыгажосць

Тоўсты зялёны Вусень марыў стаць прыгожым...

Вусень не мог уявіць сабе, калі гэта будзе, але ў тым, што яно прыйдзе абавязкова, не сумняваўся.

А пакуль ён, з захапленнем думаў: «Яшчэ, зусім трошкі – і я стану вось такім блакітным або жоўтым, як тыя кветкі, што растуць на лузе. Зялёным быць не ха-а-чу, ужо надакучыла. Можа, лепей чырвоным?»

Вусень не заўважыў, як пачаў размаўляць уголас. Глянуць з боку – дык смешна: сядзіць на сцяблінцы зялёнае стварэнне і гутарыць само з сабою.

Вялікі Жук, які ляцеў па сваіх справах, спыніўся і сеў побач.

З кім гэта ты? – спытаў ён, насцярожана пакруціў галавой, але так нікога і не заўважыў.

Вусень ад нечаканасці ўздрыгнуў і ледзь не зваліўся са сцяблінкі. Потым, памаўчаўшы крыху, сказаў: «З сабою».

– Здурнеў, – коратка вызначыў Жук і збіраўся ўжо ляцець далей, але ў апошні момант затрымаўся і спытаў: – Табе што, няма чаго рабіць?

Вусень здзівіўся:

– А я і раблю. Я аб сваей прыгажосці мару.

Цяпер ужо Жук ледзь не зваліўся са сцяблінкі і, пераляцеўшы на больш надзейную пляцоўку – трывалы ліст лапуха, пацікавіўся:

– Даўно?

– Што даўно? – не зразумеў пытання Вусень.

– Даўно ў цябе... гэта? – са спачуваннем у голасе удакладніў Жук.

– Даўно, – Вусень сціпла ўсміхнуўся і пачаў перапаўзаць са сваёй сцяблінкі, бліжэй да Жука. Па дарозе ён прадоўжыў размову: – Сапраўдная мара заўсёды жыве доўга. Яна спее ў кожнага у думках, як насенне... Яе шкадуеш, песціш, вяртаешся да яе, быццам у казачнае месца.

Жук задумліва пагладзіў лапкай свае пушыстыя вусікі і, ўважліва паглядзеўшы на Вусеня, спытаў:

– Твая мара – быць прыгожым? І ўсе? Больш нічога?

– Хіба гэта дрэнна? Прыгожым быць лепей. Іх усе любяць... А каму патрэбен я – зялёны, брыдкі, тлусты. Вось калі б я быў вельмі прыгожым, тады іншая справа. Я б зусім па-іншаму глядзеў на Свет, а Свет на мяне. Хіба гэта не сапраўдная мара?

– А хто ведае, якая мара сапраўдная, а якая не? Для мяне, напрыклад, твая мара непатрэбная, бо я і так прыгожы! – разважаў Жук. Ён ганарліва выставіў уперад сваё чырвонае брушка і паварушыўшы бліскучымі чорнымі крыламі працягваў: – У мяне свая мара. Але я табе аб ёй не скажу...

– Калі не хочаш, то не кажы... – сумна ўздыхнуў Вусень. – А я так хачу стаць прыгожым! Якім – не ведаю, але толькі б не гэткім, як зараз. Гідота!

– Хіба можна так самога сябе крыўдзіць?

Пад лістом лапуха пачулася ціхае пасопванне, і неўзабаве на ім, шпарка перабіраючы незлічонай колькасцю ножак, з'явілася Сараканожка.

– Дзень добры! Хіба можна так самога сябе крыўдзіць? – прамовіла яна зноў і ўсміхнулася. – Вунь, пабач, колькі ў мяне іх!

Яна, па чарзе падымаючы кожную ножку, зрабілася падобнай да стужкі, якую варушыць вецер.

– Што з таго? Знайшла чым ганарыцца, – здзівіўся Жук.

Сараканожка горача падхапіла:

– Вось-вось! А я пра што кажу? Знайшла! Ганаруся, і вельмі. Таму што, ў мяне іх роўна столькі, колькі мне падаравала сама Прырода. І ўсе мне патрэбныя. Камусьці іншаму яна падарыць менавіта тое, што патрэбна толькі яму. У кожнай жывой істоты свая прыгажосць.

– Прыгажосць, прыгажосць, – забурчаў нехта унізе.

На паверхні зямлі, пад лапухом, з'явілася гурбачка, з якой высунуўся Крот. Ён агледзеўся навокал і дадаў:

– Што мне да вашай прыгажосці, калі я яе не бачу...

– Сапраўдную прыгажосць заўсёды бачна, – усміхнулася яму ў адказ Сараканожка і павіталася: – Прывітанне!

– Прывітанне! – адказаў Крот і агледзеўся зноў. – Калі яна паўсюль бачная, яе схаваць цяжка. Хіба што пад зямлёю... Там яна будзе нябачная... Дык, зноў... навошта яе хаваць, калі яна патрэбна?

Вусень дапоўз-такі да ліста лапуха і нарэшце спыніўся.

– Прыгажосць патрэбна ўсім... – задумліва сказаў ён.

– Сапаўдная, сапраўдная... – буркатаў Крот, страсаючы камячкі глебы з свайго носа. – Хто ведае, якая прыгажосць сапраўдная, а якая не...

– Сапраўдная... гэта калі ўсім ад яе добра. Нават калі яе не бачыш, але ведаеш, што яна ёсць на Свеце, то ўсё адно добра... – разважаў Вусень.

Ён памаўчаў крышачку і сціпла дадаў:

– І ўвогуле... я вось падумаў... калі аднаму хораша, а другому не – хіба гэта сапраўдная прыгажосць?

– Хм! Тады выходзіць што мая прыгажосць толькі мне і патрэбна? – абурыўся Жук і, натапырыўшы вусікі, патупаў да краю лапуха каб уляцець.

Яго мякка спыніла Сараканожка:

– Пачакай! Прыгажосць не толькі ў тваіх вачах, вусіках, брушку... Яна таксама ў тваіх учынках. Хто ўчоры дапамог гаротнаму Жужалю данесці да хаткі ежу? А хто, яшчэ раней, выбавіў Матылька з павуціння? Хто падвез маленькага Мурашыка, які спаздняўся дахаты?

Жук, усхвалявана пакруціў лапкай свае пушыстыя вусікі:

– Атрымліваецца так, што прыгажосць – гэта прыгожае жыццё... Так?

– Так! Так! – засмяялася Пчолка, якая села побач. Яна ветліва памахала ўсім лапкай і дадала: – Дабрыня, Любоў, Мудрасць, Радасць, Павага да іншых гэта заўсёды прыгожа. Гэтая прыгажосць ёсць у кожнага, только трэба яе заўважыць...

Пчолка паляцела далей. Дзень працягваўся. Каля вялікага лопуха стала ціха. Усе такія розныя і, ў той жа час, такія блізкія істоты заспяшаліся па сваіх справах. У кожнага свая непаўторнасць дадзеная ім Прыродай, у кожнага ёсць тое, што не можа быць схавана...

Застаўся толькі тоўсты Вусень. Але цяпер ужо уласны колер і памеры не хвалявалі яго так, як раней. Есці чамусьці зусім не хацелася. Вочы пачалі заплюшчвацца і ў галаве круцілася адно: «Спаць. Спаць...» Вусень зразумеў: гэта нездарма, наперадзе яго чакае нешта незвычайнае.

Ён пачаў закручвацца ў мяккую коўдрачку, якая стваралася ім жа самім надзіва хутка. А потым заснуў, уладкаваўшыся пад лістом лапуха, быццам немаўлятка ў калысцы.

Якім ён будзе, калі прачнецца, Вусень не ведаў, але гэта ўжо не было так важна. У невядомую таямнічую вандроўку ён узяў з сабою галоўнае – адчуванне Прыгажосці Свету...





# Зайчыкава Мара

Маленькі Зайчык марыў пра вялікую морквачку...

Схаваўся пад старой елкай і думаў: «Буду грызьці яе доўга, доўга. Нікому не дам!»

Уздыхнуў, вочкі прыкрыў: «Калі ўжо тое Лета прыйдзе? Хутчэй бы. Гэтак хочацца смачненькай морквачкі. Яна ж, пэўна, салодкая...»

Маленькі шэрачок, на самай справе, той морквачкі яшчэ ніколі не бачыў і смаку яе не ведаў. Але Зайчыха-маці, гэтак прыгожа расказвала пра яе, што Зайчык не мог дачакацца, калі прыйдзе сапраўднае цяпло і тады там, за пагоркам, на полі, з'явіцца тая запаветная морквачка...

«Пэўна яна круглая... Не! Лепей няхай будзе доўгаю, каб хвосціка не бачна!» – думаў Зайчык, уяўляючы яе кожны раз па-іншаму. «Якая ж яна, морквачка, сакавітая і хрумсткая! Аж у роце смачна стала...» – войкнуў Зайчык.

«Ты чаго?» – пачуў ён. Зайчык спалохаўся, прыціснуў вушкі, падціснуў лапкі. Пабачыць збоку: маленькі шэры камячок, амаль нябачны пад елкай. Зайчык пачакаў крышачку, узняў галаву, натапырыў вушкі і азірнуўся...

Крыху наводаль ад яго сядзела шэрае Мышанятка, грызла сухую сцяблінку і уважліва пазглядала на маленькага Зайчыка.

– Ты чаго? – зноў спытала Мышанятка і пацягнулася за другой сцяблінкай.

– Я пра морквачку мару, – сціпла усміхаючыся, адказаў Зайчык.

– А яе есці можна? – бліснула чорнымі вачанятамі Мышанятка, але потым засаромелася. – Прабач, але я ўвесь час, чамусьці, есці хачу...

– Яна смачная... – задумліва адказаў Зайчык і, памаўчаўшы крыху, дадаў: – Толькі я яе яшчэ не бачыў ніколі...

– Дык адкуль тады ведаеш? – здзівілася Мышанятка.

– Мне матуля казала, – сказаў Зайчык і уздыхнуў. – Хутчэй бы ўжо Лета. Летам добра! Сонейка грэе...

– Ага, цёпла! І насення рознага шмат! – падтрымала Мышанятка, потым уздыхнула таксама і няўпэўнена спытала: – А ты мне той морквачкі дасі пакаштаваць? Крышачку...

– Не дам! Самаму мала будзе! – прабурчаў Зайчык.

– Не дасі, дык не дасі. Не трэба. Яно і вядома: усім есці хочацца.

Мышанятка зноў уздыхнула, паглядзела на веснавое Неба і хацела было бегчы далей, але пачула ціхае:

– Пачакай! Давай разам...

– Што разам? – здзівілася Мышанятка.

– Разам пра морквачку марыць! Пра Лета... Прабач мяне, што я вось гэтак...

Маленькі Зайчык апусціў сарамліва вочы:

– Мне морквачку не шкада, я з табой абавязкова падзялюся і яшчэ каго-небудзь пачастую! Проста я зараз таксама... есці хачу...

Мышанятка радасна усміхнулася і пасунулася бліжэй:

– А давай, яшчэ пра кветачкі марыць? Мне маці казала, што яны прыгожыя!

Пад вялікай старой елкай сядзелі два маленькія шэранькія камячкі і марылі разам... Пра што?

Пра, тое, што некалі скончацца халодныя дні і прыйдзе цёплае ласкавае Лета. Ім пра гэта расказвалі матулі. Якое яно, гэта Лета, Зайчык і Мышанятка не ведалі: ў іх жыцці яго яшчэ не было...

Два маленькія пухнацікі сядзелі, цесна прытуліўшыся адзін да аднаго... І не важна, калі яны ўбачаць вялікую морквачку і колькі дзён ім чакаць чароўнага Лета...

Маленькі Зайчык і маленькае Мышанятка сагравалі адно аднаго і пачыналі разумець, што у гэтым Свеце, часам гэткім халодным, ёсць тое, ад чаго заўсёды становіцца цяплей...





# Божая Кароўка і сем кропак

Божая Кароўка ўчора навучылася лічыць да сямі...

Гэтаму яе навучыў даўні сябар Мурашык, які жыў у сваім вялікім дамку-мурашніку за ручаём. Мурашык казаў, што ў яе на спіне сем кропак.

Чаму менавіта сем, а не больш, ці менш – Кароўка не ведала, але Мурашык паабяцаў запытацца пра гэта ў свайго знаёмага – вялікага, пухнатага Чмяля. Ён далёка лятае і на усё можа знайсці адказ.

Таму сёння, з самага ранку, Божая Кароўка ўладкавалася на жоўтай сярэдзіне рамонка адкуль была добра бачна сцяжынка, па якой звычайна штодзень прабягаў яе сябар.

Па сцяжынцы рухалася вялікая колькасць малых насельнікаў наваколля, якія спяшаліся па сваіх справах. Зверху здавалася, быццам праз увесь луг цягнецца жывая танюткая стужка. Кароўка пільна сачыла за ёй і час ад часу шэптам паўтарала: «Адзін, два, тры... Адзін, два, тры, чатыры, пяць, шэсць, сем!» З гонарам паглядала навокал: «Вось бы хто заўважыў!» Але нікога побач не было і таму яна змоўкла.

Каб здалёк заўважыць свайго сябра, Кароўка пераляцела на галінку чаромхі, што расла на адзіноце пасярод лугу, і ледзь паспела скласці свае мяккія крылцы, як пачула нечае буркатанне: «Чаго забылася тут?»

Божая Кароўка азірнулася і ўбачыла таго самага Чмяля, якога павінен быў знайсці Мурашык.

– Я вас патурбавала? – спытала яна і дадала: – Калі так, прабачце, калі ласка.

Чмялю ад гэткай уважлівасці стала няёмка, і ён загудзеў больш ветліва:

– Ну-у, не моцна... Я спаў, а ты мяне разбудзіла, а я, між іншым, сёння моцна стаміўся, бо выконваў вельмі важнае даручэнне, трохі змок ад расы і змерз.

Маленькая Кароўка сціпла усміхнулася і яшчэ раз папрасіла прабачэння.

Яе збянтэжаны выгляд надалі Чмялю адчуванне ўласнай значнасці, ён натапырыў вусікі, выставіў уперад паласатое брушка і сказаў:

– Даручэнне я выканаў! Цяпер чакаю Мурашыка, каб яму ўсё растлумачыць.

Кароўка войкнула:

– Дык гэта ж пра мае кропкі, напэўна...

– А ты колькі іх маеш? – запытаўся Чмель.

– Адзін, два, тры, чатыры, пяць,шэсць... сем! – з гонарам адказала Кароўка.

– Яны! – дзелавіта вызначыў Чмель і спытаў: – Навошта?

– Што «навошта»? – не зразумела Кароўка.

– Ну, навошта табе ведаць?

– Я ж іх на сабе нашу... Чаму менавіта столькі, а не меньш, або больш?

– Хіба цяжка?

– Што «цяжка» – зноў не зразумела Чмяля Кароўка.

– Цягаць на сабе свае кропкі!

– Не, не цяжка, але чаму іх сем?

– Дзівачка, я ж не пытаюся, чаму я паласаты?

– Чаму? – здзівілася Кароўка.

Чмель схапіўся лапкамі за галаву:

– Таму што мне гэта не-ці-ка-ва! Зразумела?

– Не... А хіба можна быць нецікавым самаму сабе?

– А-а-а, я вось думаю пра тое, дзе знайсці больш нектару!

– Чаму?

– Каб есці! А есці – каб жыць!

– І... ўсё?

Цяпер не зразумеў ужо Чмель:

– Што – усё?

– Калі толькі есці, хіба гэта значыць жыць?

Чмель задумаўся на хвілінку, а потым з упэўненасцю адказаў:

– Калі не буду думаць пра гэта – з голаду памру.

– А ты і думай, толькі не ўвесь час...

– Х-мм! Пра што яшчэ можна думаць, калі з ранку да вечара працуеш?

Пытанні Кароўкі, здаецца, зусім раззлавалі Чмяля, але ён горача даказваў Кароўцы тое, што, напэўна, больш хацеў даказаць самому сабе.

– Чаму некаторыя кветкі складваюць свае пялёсткі ноччу? Чаму лісце зялёнае? Чаму адзін вырастае вялікім, а другі – малы? Чаму...

– Ча-му-ч-ка! – падвеў вынік размове Чмель і яшчэ раз паўтарыў: – Чамучка! Самая сапраўдная!

– Вось і маці мая тое кажа... – сумна прамовіла Кароўка і ўздыхнула. Яна збіралася ўжо зноў пераляцець на рамонак, але Чмель спыніў яе:

– Я ведаю, чаму ў цябе семь кропак на спіне. Старая Сава казала... Сем кропак – сем дзён тыдня. Дні складаюць тыдзень. Тыдзень, месяц, год, жыццё.

– А чаму?..

– Пачакай. Добрыя дні – добрае жыццё.

– Як гэта – добрыя?

– Не ведаю...

– Чаму тады...

На сцяжынцы, нарэшце, паказаўся Мурашык.

– Вось у яго і запытайся! Спяшаюся я... – убачыўшы яго, прабуркатаў Чмель.

Кароўка не паспела нават падзякаваць яму – гэтак хутка ён паляцеў.

– Добрыя дні складаюць добрае жыццё! Адзін, два, тры... – паўтарала Божая Кароўка. Яна махнула Мурашыку лапкай і спусцілася на сцяжынку.

– Добрыя дні складаюць добрае жыццё! – замест прывітання казала яна. – Зразумела! Калі ты зрабіў нешта добрае, то і дзень будзе добры!

– Наша матуля заўсёды гэтак кажа ўсім Мурашам кожную раніцу! – падтрымаў яе Мурашык, павітаўся і працягваў. – А яшчэ яна кажа, што калі ты не зрабіў ніводнай добрай справы, дзень прайшоў дарма...

– А мая маці заўсёды кажа, што добры ніколі нікому нічога злога не зробіць, – сказала Божая Кароўка, памаўчала крыху і потым задумліва дадала: – Добрае заўсёды мацнейшае. А мае кропкі, дзеля каб той, хто іх убачыць, успомніў пра гэта. Вось таму іх сем! Зразумела нарэшце! Дзякуй табе, Чмялю ды Саве!

Мурашык агледзеўся:

– А дзе ён?

– Паляцеў ужо. А яшчэ, казаў, што я сапраўдная чамучка. Хіба гэта дрэнна?

– Гэта добра, вельмі добра. Мая матуля кажа ўсім нам у мурашніку, што калі ёсць пытанні, то я ведаю, што вы заўважаеце тое, што існуе вакол вас. Калі ёсць пытанні – знойдуцца і адказы...

Сонца ўсё вышэй уздымалася над лугам. Мурашык паглядзеў на яго і заспяшаўся:

– Прабач, але мне таксама трэба бегчы. Я рады, што мы цяпер ведаем, чаму ў цябе сем кропак.

Мурашык пабег па сваіх справах. Пачынаўся дзень, чарговы дзень у якім заўсёды ёсць месца добрым справам... Божая Кароўка паглядзелася ў люстэрка кропелькі расы і засмяялася:

– Адзін, два, тры, чатыры, пяць, шэсць, сем! – І ўжо сур'ёзна дадала. – Сем добрых дзён, тыдзень, месяц, год... Добрае Жыццё!

Узняла крылцы і паляцела насустрач сваім дням...





# Мядзведзік і Дождж

Мядзведзік вельмі любіў плакаць, калі ідзе дождж...

Як толькі з Неба падалі першыя кроплі, Мядзведзік станавіўся сумным і... вось вам, калі ласка... з круглых, быццам сінія пацеркі, вачанятак адна за адной каціліся слезы. Пакідалі на мяккай поўсці танюткія сцяжынкі, збіраліся на кончыку носа, а потым кап-кап-капалі ўніз.

Сення Шэрая Хмарка доўга вісела ў куточку над лесам, потым выпаўзла на сярэдзіну Неба, надзьмулася і пырскнула дробненькім дожджыкам.

«Вох-вох-вох! Зноў Неба плача... Трэба яго суцешыць!» – падумаў Мядзведзік і пыхкаючы хуценька пабег на бераг возера. Там, пад вялікай бярозай, у яго была свая хованка – месца, дзе можна пабыць аднаму...

Што яшчэ можна зрабіць, каб дапамагчы Небу, Мядзведзік не ведаў. Але калі плачаш адзін, то зусім сумна. «Лепей ужо ўдвух», – вырашыў ён калісьці і таму стараўся заўсёды дапамагчы Небу сваімі слязьмі. Нікому ніколі пра гэта не расказваў: баяўся, што будуць смяяцца.

Мядзведзік уздыхнуў раз другі... У носе знаёма зашчыпала. Кап-кап-кап... Сустракаліся з кроплямі дажджу і разам падалі ў возера яго слёзы.

З вады высунуліся два карасікі, паківалі галовамі і зніклі, на развітанне пляснуўшы па вадзе хвастамі. Мядзведзік уладкаваўся зручней і зноў уздыхнуў: «Вох-вох-вох! Дзе ж Неба не будзе плакаць, калі яно нас усіх шкадуе! Вунь учора Мурашык прышчаміў сваю лапку, а маленькі паласаты Жучок, што жыве пад старым пнем, змачыў раніцай брушка і захварэў».

На кончык носа скацілася чарговая кропля... Мядзведзік зноў уздыхнуў і са спачуваннем паглядзеў у Неба: «Стракатага Дзятла ўчора, напэўна, нехта пакрыўдзіў, бо крыку было шмат. Шкада яго... Зязюлю-гультайку і тую шкада. Кінула сваіх дзетак невядома дзе. Цяпер гукае...»

Дожджык не спыняўся, быццам праз дробнае сіта, церусіў ціхенька на Зямлю. Здаецца нехта невядомы там, наверсе, таксама лье свае слёзы... Нават шэпт лісця пад кроплямі ствараў сваю сумную дожджыкавую мелодыю... Мядзведзік слухаў, зрэдку выціраючы лапкай мокрыя вочкі. Шморгнуў носам раз другі...

«Ну хопіць табе ўжо!» – пачуў ён.

На вялікім лісце жоўтага гарлачыка сядзела зялёная Жабка. Яна падстаўляла дожджыку бліскучую спінку і, насмешліва паглядаючы на Мядзведзіка, працягвала:

– Колькі можна плакаць? Гляджу на цябе – усё румзаеш! Чаму? Калі пакрыўдзіў хто – даруй яму. Не трэба плакаць: Небу цяжка!

Мядзведзік разгубіўся:

– Як цяжка?

– Калі нехта плача, усім цяжка. Той хто плача, згубіў Радасць.

– А чаму Неба плача?

– Яно не плача. Яно ваду нам усім дорыць. Дожджык – гэта ж добра!

Жабка падпрыгнула на лісце гарлачыка і засмяялася:

– Паслухай, як весела спяваюць яго кроплі на маей спіне! Сапраўдны барабан!

– А мне здавалася, што дожджык – гэта слёзы Неба... Яно нас любіць і шкадуе – таму плача... – задумліва прамовіў Мядзведзік.

Мядзведзік упершыню расказваў пра патаемнае і не саромеўся. Напэўна таму, што адчуваў: яго зразумеюць. Ён уздыхнуў зноў і дадаў:

– Я плакаў, каб дапамагчы Небу! Аднаму плакаць цяжка.

– А навошта ўвогуле плакаць? Калі шкадуюць, хіба абавязкова плачуць? Каму дапамогуць твае слёзы? – здзівілася Жабка.

– Я так думаў... – адказаў Мядзведзік, выціраючы лапкай чарговую кропельку на носе.

– Дарма! Кажу табе – дарма! Праз слезы ўбачыць штосьці цяжка... не тое каб дапамагчы, – разважала Жабка.

– Як гэта? – не зразумеў Мядзведзік.

– Як, як! Я да цябе, між іншым, звярталася некалькі разоў, але ты не чуў і не бачыў!

Мядзведзік пачырванеў:

– Прабач, я сапраўды цябе не бачыў...

– Вось, вось! Не бачыў! Калі ў вачах толькі слезы, што яны заўважаць?

Жабка высока падпрыгнула і засмяялася:

– Азірніся вакол! Бачыш?

– Што?

– Свет! Паглядзі, які ён прыгожы! Цікавы!

Мядзведзік доўга прыглядаўся, смешна зморшчыўшы нос, а потым няўпэўнена адказаў:

– Ну... бачу...

– Што? – спытала Жабка.

– Возера, бярозу... – Мядзведзік памаўчаў крыху і дадаў: – Вунь карасікі з вады высунуліся, не могуць размаўляць, гаротныя...

– Пачакай, чаму ж яны гаротныя? – спыніла Мядзведзіка Жабка. – Яны ж размаўляць здольныя! Проста ты іх пакуль не зразумеў!

Мядзведзік здзіўлена паглядзеў на карасікаў, на Жабку, зноў на карасікаў... а потым ціха прашаптаў:

– Жабка! Яны ж мне ўсміхаюцца...

– Ну вось! Нарэшце заўважыў! Так, так, усміхаюцца... і даўно. А яшчэ, вунь тая Качка колькі разоў ужо хацела табе сказаць, што ад тваіх слёз вада ў возеры хутка стане салёнай.

Мядзведзік ад гэткіх слоў зусім засаромеўся, апусціў вочкі і, паціраючы лапкамі мокры нос, ціха сказаў:

– Прабачце, калі ласка.

Дожджык скончыўся... Апошнія кроплі зрэдку падалі з Неба, пакідаючы на вадзе вялікія кругі. Кругі разыходзіліся па паверхні возера і паступова знікалі. Паказалася Сонейка, і шэрая Хмарка ўжо не здавалася такой шэрай і надзьмутай. Заспяваў рознымі галасамі Лес. Сушылі свае пялёсткі кветкі. Ўзняліся ў паветра рознакаляровыя матылькі.

Мядзведзік здзіўлена азірнуўся:

– Колькі я раней... не бачыў!

– Мы бачым тое, што здольныя бачыць. Калі ў цябе ў вачах слёзы, што заўважыш, акрамя сваіх слёз? – спытала зялёная Жабка і сама ж адказала: – Ні-чо-га!

Мядзведзік падняўся, страсаючы з сябе кропелькі дажджу... Яны разляцеліся на ўсе бакі вясёлкавымі колерамі пераліваючыся ў промнях Сонейка. Мядзведзік засмяяўся, спачатку ціха і няўпэўнена, а потым усё гучней. Яго смех вясёлымя званочкамі разляцеўся па наваколлі. Мядзведзік змоўк, здзіўляючыся сам сабе...

– Як радасна бачыць Свет... – задумліва прамовіў ён, а потым памаўчаўшы крыху, ціха дадаў: – Я не хачу больш плакаць! Праз слёзы сапраўды нічога не бачна!

Мядзведзік усміхнуўся: на яго нос асцярожна сеў прыгожы блакітны Матылек. Узнімаліся танюткія крылы, пяшчотна высушваючы мокрыя сцяжынкі на мяккай поўсці... Мядзведзік не варушыўся. Стаяў, ледзь дыхаючы, і адчуваў як знікаюць яго апошнія слезы...





# Ружовы Кот

Ружовы кот сядзеў на воблаку і паглядаў уніз…

Зверху ўсе здавалася зусім маленькім, быццам дзеці раскідалі па стракатай коўдры свае цацкі. Ружовы Кот пацягнуўся і улёгся на воблаку ямчэй, каб лепш было назіраць за ўсім, што адбываецца на Зямлі.

Там паступова абуджалася пасля начнога сну жыццё. Заспявалі пеўні, заспяшаліся па сваіх справах людзі… Рэчка прыгожай стужкай паблісквала на Сонцы, нібы малако на сподачку, пакінуўшы пад пагуркамі рэшткі густога белага туману.

Ружовы Кот прыкрыў вочы, дазволіўшы Сонцу пагрэць сабе спіну. Кот быў незвычайны не толькі ад таго, што сядзеў на воблаку і меў ружовы колер. Незвычайныя ў яго былі вялікія, блакітныя вочы. Яны быццам ахоплівалі ўсё Неба і бачылі ўдалечыні тое, што часам не заўважалі іншыя: Ружовы Кот быў з Краіны Дзяцінства. Ён жыў на воблаку і складаў сны, калі надыходзіла ноч, дасылаў іх, як каштоўныя паштоўкі людзям на Зямлю.

Сны былі розныя: смешныя, жартаўлівыя, сумныя, але ўсе – ласкавыя, мяккія, быццам пяшчотныя рукі маці. Там унізе, людзі не ведалі, адкуль з'яўляюцца гэтыя сны… Дзеці проста радаваліся ім, а дарослыя здзіўляліся і шукалі патаемныя знакі, якія растлумачылі б сэнс убачанага… У кожнага, хто бачыў гэтыя сны, назаўсёды заставалася адчуванне ўзнесласці і гармоніі. Напэўна, таму расказваць пра іх нікому не хацелася. Вялікім скарбам захоўваліся яны ў кожнага ў самым патаемным куточку душы, саграваючы яе сваім святлом.

За складаннем сноў час ляцеў непрыкметна. Але калі апошнія зоркі закрывалі свае стомленыя вочы, Ружовы Кот таксама адчуваў стому і звычайна засынаў. Толькі на гэты раз ён заснуць не змог – Кот ўбачыў маленькую Дзяўчынку…

Дзяўчынка бегла да рэчкі, нібы гарэзлівы конік, высока падскокваючы, каб не намачыць расою спадніцу. Тонкія ножкі, паблісквалі ў траве, коска расплялася і светлыя ільняныя валасы лёгка ўздымаліся ў паветры.

Сёння Дзяўчынцы прысніўся ружовы сон! Такі прыгожы сон! Дзяўчынка прыбегла да рэчкі і, радасна смяючыся, акунулася ў ранішную прахалоду вады. Павіталася са знаёмай качкай, ўзняла ўверх галаву і... убачыла на воблаку Ружовага Ката!

Дзяўчынка здзівілася незвычайнаму відовішчу, але разам с тым, ніскольні не спалохалася.

– Прывітанне! – павіталася яна з Катом.

– Прывітанне! – усміхнуўся ў адказ Ружовы Кот.

– Што ты там робіш? – пацікавілася Дзяўчынка.

– Я тут жыву, – прамуркатаў Кот. – Складаю сны і адпраўляю іх потым людзям на Зямлю як паштоўкі. Хочашь сюды, бліжэй да Сонейка?

– Хачу! – згодна заківала галавой Дзяўчынка. – А як да цябе дабрацца?

Кот упершыню зрабіў гэткую прапанову. Але на ўспамін прыйшло тое, што ён бачыў раней: як вецер размятае гурбы аблокаў па Небе, і яны, доўгія, белыя, становяцца падобнымі да воўны. Кот ціхенька падрапаў лапкай край воблака, і з яго выцягнулася лёгкая пасмачка...

Як скручваюць воўну ў ніткі, Дзяўчынка ведала. Яна неаднойчы сядзела побач са сваёй бабуляй і, нават, некалькі разоў спрабавала ёй дапамагчы. Тады гэтая справа ў яе атрымлівалася кепска – нітка была няроўная. Бабуля ласкава суцешала тым, што Дзяўчынка проста яшчэ маленькая, пройдзе зусім няшмат часу – ўсе атрымаецца...

Зараз і сапраўды ўсё атрымалася – хутка з Неба на Зямлю пацягнулася танюткая, але трывалая белая ніць. Воблака значна паменьшылася ў сваіх памерах. Разлегціся як раней, на ім было ўжо немагчыма, затое ўнізе стаяла маленькая Дзяўчынка і, сціскаючы ў руцэ канец ніці, з надзеяй глядзела ў вышыню...

Ружовы Кот падхапіў лапкай, ледзь бачную нітку і пачаў падцягваць яе да сябе. Быццам верабейка зляцеўшы з галінкі, Дзяўчынка лёгка адарвалася

ад Зямлі і ўзнялася ў паветра...

Яна ўладкавалася побач з Катом і агледзелася...

Сядзець на воблаку было мякка і ўтульна. Гукі Зямлі даносіліся знізу лёгкім пчаліным гудам. Па Небе плылі вялікія пухнатыя аблокі. Каб яны былі крыху бліжэй, Дзяўчынка паскакала б па іх, як паветраны конік.

– Адкуль ты з'явіўся? – запыталася яна ў Ката.

– З Краіны Дзяцінства, – прамуркатаў Ружовы Кот.

– Таму ты ружовы? – зноў пацікавілася яна.

– Так! – адказаў Кот.

– І вочы ў цябе, як Неба, – працягвала Дзяўчынка, – Вунь яно якое прыгожае!

– У цябе таксама вочы, як Неба – усміхнуўся Ружовы Кот.

– Не, мае вочы – як валошкі! Мне так маці казала! – засмяялася Дзяўчынка і ўдакладніла: – Валошкі падобныя да твайго Неба – гэткія ж блакітныя і прыгожыя!

– У нас усіх адно Неба, – усміхнуўся Ружовы Кот.

Ружовы Кот і Дзяўчынка сядзелі на воблаку і размаўлялі. Здавалася, яны ведаюць адзін аднаго ўжо даўным-даўно.

– А мне сёння прысніўся сон, – сказала Дзяўчынка. – Ён светлы і радасны... Я яго нікому там, унізе, не расказвала... Хочаш, табе раскажу?

– Я ведаю твой сон,– Ружовы Кот заплюшчыў вочы. – Я яго табе падараваў сёння ўначы.

Дзяўчынка войкнула і ціха засмяялася.

– Як жа я не здагадалася, што я і зараз сплю! – дзеля упэўненасці ў гэтым, яна ўшчыкнула сябе і войкнула ад болю.

– Навошта шчыпаць сябе, я б і так падцвердзіў, што ты не спіш! – прамуркатаў Кот.

– Значыць, і ты сапраўдны?

– А як бы ты інакш паднялася сюды? – неспешліва разважаў Ружовы Кот. – Я самы сапраўдны Ружовы Кот з Краіны Дзяцінства. Калі ты не верыш, што такая краіна існуе, тады мяне сапраўды няма...

– Не, я веру, веру! – паспяшалася запэўніць яго дзяўчынка. – Шкада толькі, што дзяцінства з часам знікае.

Уважліва паглядзеўшы на Дзяўчынку, Кот пакруціў галавой.

– Дзяцінства ніколі не знікне, калі людзі не забудуць пра яго.

– Я не забуду! – горача запэўніла Ружовага Ката Дзяўчынка. – Дзяцінства прыгожае, як казка! І сон твой помніць буду!

Яны памаўчалі крыху, паглядаючы ўніз на Зямлю, а потым Дзяўчынка зноў спытала:

– Цяжка складаць сны нам, людзям?

Ружовы Кот усміхнуўся:

– Не! Але часам цяжэй даслаць іх таму, каму яны патрэбныя.

– А што бывае з гэткімі снамі?

– Застаюцца ў Небе, лятаюць у паветры, як нябачныя птушкі.

– А калі іх паклікаць, яны прыляцяць?

– Вядома.

Дзяўчынка задумалася, а потым рашуча сказала:

– Твае сны ўсім патрэбныя! Ад іх на сэрцы радасна! Ведаешь, мая бабуля кажа: «Радасць, Каханне, Дабрыня крынічнай вадою сэрца натоляць калі ідзеш па дарозе жыцця».

Дзяўчынка глянула ўніз на Зямлю.

– Трэба мне дахаты, – сказала яна Кату.– Бачыш, вунь мяне ўжо матуля шукае.

Яна пагладзіла Ката па ружовай поўсці.

– Я буду пра цябе помніць! Дзякуй табе!

– На маім воблаку заўседы знойдзецца месца, сказаў Кот і заплюшчыў вочы, каб Дзяўчынка не заўважыла ў іх сум.

Учапіўшыся за нітку, Дзяўчынка лёгка слізганула ўніз і адразу стала маленькай кропкай на беразе рэчкі. Памахала Ружоваму Кату рукой і пабегла дадому, да зямных спраў, што чакалі яе.

Белыя аблокі працягвалі сваё падарожжа ў высокім блакітным Небе. Здаецца, і не было той сустрэчы...

Але Дзяўчынка цяпер ведала, што з блакітным Небам яе звязвае тонкая, але вельмі моцная ніць, а там, наверсе, на белым пухнатым воблаку, жыве Ружовы Кот у вачах якога можна ўбачыць тое, што хочаш сказаць сам.

А Ружовы Кот, прыгрэўшыся на сонцы, заснуў. Ён ведаў: яго сны заўсёды будуць патрэбныя.

Калі надыйдзе наступная ноч, ён зноў будзе складаць і дасылаць іх людзям, каб не абрываліся тоненькія нітачкі паміж Зямлёю і Небам...





# Конік і Скрыпачка

Конік чакаў вечара, час ад часу паглядаючы на маленькую зялёную Скрыпачку, што ляжала побач... Загорнутая ў мяккі мох, яна доўга захоўвалася пад елкай і вось нарэшце спатрэбілася...

Скрыпачка была старэнькая, з дзе-нідзе падрапанымі бакамі, са шчылінкай пасярэдзіне, але спявала яна так, што, напэўна, не было ва ўсім наваколлі ніводнай жывой істоты, якая б не прыходзіла яе паслухаць.

Колькі памятаў Конік, на Скрыпачцы кожны вечар граў яго Дзед. Высокі, зусім сівы, ён павольна праводзіў смычком па струнах – і ў паветра лілася Песня...

Аднойчы ён паклікаў да сябе ўнука і працягнуў яму Скрыпачку:

– Вось, трымай... беражы яе... і сябе таксама.

– А як жа твая Песня? Што адкажаш на лузе сваім слухачам? – запытаўся Конік.

– Цяпер твая чарга...

– Я не змагу так, як ты...

– І не трэба. У кожнага свая Песня...

– Дык навошта яны слухалі тваю?

– Каб абудзіць сваю... У кожнага сэрца спявае, толькі часам гукі вельмі слабыя, не заўседы чутныя...

– Твая Скрыпачка ім дапамагала?

– Спадзяюся, што так...

– І ніводнай аднолькавай Песні няма?

– Мы ўсе розныя.

– Пра што будзе мая?

– Пра тое, што раскажа тваё сэрца...

– Ці зразумеюць мяне?

– Той, хто ўважлівы да іншых, зразумее...

– Ты шмат пажыў на Свеце, табе ёсць аб чым расказаць...

– Пакуль не ведаеш аб чым – пачакай...

Дзед беражліва пагладзіў Скрыпачку і працягнуў яе Коніку:

– Трымай.

Невялічкая, лёгкая, яна адразу спадабалася Коніку, але тады ён не ведаў ніводнай мелодыі... Таму, прынесшы яе дамоў, паклаў у сваю схованку.

З таго часу на Лузе не было чуваць знаёмых гукаў. Звыклыя да іх слухачы спачатку ўсё пыталіся ў Дзеда, калі нарэшце пачуюць Скрыпачку. Ён, усміхаючыся крыху сумна, адказваў ім:

– Пачакайце... прыйдзе час...

Калі не стала Дзеда, Конік засумаваў... Так не хапала таго, хто заўседы мог падтрымаць сваёй мудрасцю і дабрыней, з кім было ўтульна... Асабліва надыходзіла адзінота, ўвечары, калі Сонца лічыла дзень скончаным і збіралася адпачываць.

Новы дзень, потым ноч і ўсе паўтаралася ізноў аднолькавай чарадой... Скрыпачка маўчала.

Вось калі побач быў Дзед, тады ўсё было па-іншаму. Ён паўсюль мог заўважыць нешта цікавае.

Конік уздыхнуў:

– Ізноў-такі «быў»...

Калісьці ён спытаў Дзеда:

– Што такое Жыцце?

Той усміхнуўся і адказаў надзіва проста:

– Усе тое, што вакол нас, і мы ў ім... у яго гуках, колерах... толькі трэба гэта адчуваць.

– Як адчуваць?

– Кожны па-свойму, у пэўны час...

Аднойчы Конік азірнуўся і ўбачыў тое, чаго чамусьці не заўважаў раней...

Як прыгожа пачынаецца новы дзень!

Кропелькі расы віселі на танюткім павуцінні, пабліскваючы, быццам дыяменты… Кветкі на лузе цягнулі свае пялёсткі насустрач пяшчотным промням Сонца… Нават шэрыя хмаркі, якія прытуліліся ў куточку за пагоркам не выглядалі сумна, а віселі ў Небе, падобныя на пухнатых, крыху надзьмутых камячкоў.

Конік здзіўляўся самому сабе: дзе ён быў?

Ён падскокнуў высока, ускінуўшы худыя доўгія ножкі і засмяяўся радасна. Стала так лёгка! Паўсядзённыя справы больш не здаваліся яму шэрымі і аднолькавымі…

Быццам толькі цяпер новы дзень прынес з сабою непаўторны, вялікі цуд, які называецца адным невялікім словам «Жыццё»… Хіба Жыццё можа быць аднолькавым?

Конік чакаў вечара, час ад часу паглядаючы на маленькую зялёную Скрыпачку, што ляжала побач…

Неба, няспешліва падлічваючы кожную сваю зорку, паступова запаўнялася імі. Надышоў вечар і змяніў яго колер з блакітнага на цемнасіні. Стала ціха…

Зялёны Конік узяў Скрыпачку…

Асцярожна крануў смычком струны – раз, другі, трэці… На лузе пачулася яго Песня!

Зліваліся паміж сабой і несліся ў вільготнае паветра гукі, складаючы вядомую толькі аднаму выканаўцу мелодыю. Так спявае кожнае сэрца, калі надыходзіць пэўны час…

Конік граў і у яго Песні было Жыццё… Водар кветак, цяпло Сонца, звон дажджу, шэпт ветру – хіба можна пералічыць усе?

Конік граў!

Маленькая, сціплая Скрыпачка стварала ў бязмежнай канцэртнай зале гукі… То пранізліва-высокія, то таямніча-нізкія, несліся яны ў вышыню, расказваючы пра тое, што жыло ў яго сэрцы…

Гэтая Песня радавала, хвалявала, напаўняла сабой ўсё наваколле…

Натхненне аднаго перадалося іншым...

Зялёны Конік скончыў граць і здзівіўся: колькі вакол слухачоў!

– Ну, вось, казалі, што Скрыпачку больш не пачуем, а яна зноў заспявала! – пачулася ў цішыні.

– Гэта Песня майго Дзеда! – засаромеўся Конік.

– Ён спяваў па-іншаму... Гэта – твая Песня! Дзякуй табе...

Зноў стала ціха...

Слухачы паступова разыходзіліся дамоў, пяшчотна трымаючы ў сабе пачутую імі мелодыю. І разам з ёй у кожнага, недзе там у глыбіні, адгукаючыся чыстым струменьчыкам, складалася свая Песня – Песня свайго Сэрца...

А Конік сядзеў на ўскрайку ліста і глядзеў на зорнае Неба, беражліва прыціскаючы да сябе сваю Скрыпачку...





# Рамонак і Любоў

Рамонак асцярожна расправіў свае пялесткі, уздыхнуў і зноў пачаў варажыць.

– Любіць-не любіць... Любіць-не любіць... Не любіць... Ніхто мяне не любіць! Колькі не лічы, – загнуўшы апошні пялёстак, сумна прамовіў ён. Падумаў крыху і дадаў ўпарта:

– Усё ж такі палічу яшчэ!..

Толькі ён зашаптаў словы адвечнай варажбы, як пачуў насмешлівае хіхіканне. Рамонак асцярожна зірнуў у бок...

Там пад самым плотам шыкоўна размесцілася яго суседка – Крапіва. Крапіва ні з кім не сябравала, а жыхары агародчыка з ўласнага вопыту ведалі: лепш з ёю не звязвацца!

– Зноў за сваё ўзяўся? – з'едліва спытала яна.

Рамонак апусціў галоўку і ледзь чутна прамармытаў:

– Добра, што ў цябе кветкі малыя...

– Што з таго? – здзівілася Крапіва.

– Не трэба варажыць пра Любоў...

– Хм! Навошта пра яе варажыць?

– А як жа? Дрэнна, калі ніхто не любіць...

Крапіва фанабэрыста азірнулася.

– А мне гэта не патрэбна. Галоўнае, каб я сама сабе падабалася!

– Калі ведаеш, што патрэбны камусьці – лепей жыць у Свеце, – задумліва прамовіў Рамонак.

Крапіва нахілілася да Рамонка і ціхенька сказала:

– Калі цябе ніхто не любіць, можа аддасі мне крышачку свайго месца?

– Як гэта? – разгубіўся Рамонак.

Крапіва зноў нахілілася да яго і растлумачыла:

– Калі ты нікому непатрэбны, навошта тады займаць столькі...

Не паспела яна сказаць апошнія словы, як аднекуль пачуўся ласкавы голас:

– Я ўсіх вас люблю! Вы ўсе мне патрэбныя!

Рамонак узняў галоўку, агледзеўся навокал, але нікога не ўбачыў. Крапіва, баязліва азірнуўшыся, адсунулася ад Рамонка крыху далей.

– А-а, гэта так... Запыталася проста... Я тут ні пры чым!

– Ні пры чым?! – залямантавала Маліна, якая жыла побач з Крапівай. – А хто заўседы пячэцца?!

– Падумаеш! Толькі адзін разочак, і тое было незнарок, – агрызнулася Крапіва.

– Вы толькі паслухайце! У Крапівы – і «незнарок»! – загаманіла ўсе насельніцтва агародчыка.

Вялікі жоўты Кабачок, які дагэтуль спакойна грэўся на Сонейку, паварушыўся і дэлікатна папрасіў:

– Паважаныя, трошкі цішэй!

Дзе там! Раслінкі пачалі высвятляць, хто, калі і за што каго пакрыўдзіў. Узняўся такі шум, што Рамонак не ведаў, куды схаваць сваю галоўку.

Ужо ніхто не памятаў, з чаго ўсе пачалося! Сварка расла нібы вялікая навальнічная хмара. Здавалася, яшчэ крышачку – і грымне...

– Я вас усіх вельмі люблю! Вы ўсе мне патрэбныя! – пачулася зноў недзе з вышыні.

Гэтыя ціхія і ласкавыя словы прынеслі цішыню і спакой. Раслінкі спынілі сварку і паглядзелі вакол сябе... Усе тыя ж знаёмыя твары... Незразумела, чый голас звяртаецца да іх?

Ізноў пачулася ціхае і ласкавае:

– Вы ўсе – мае дзеці. Як можна вас не любіць?

Кабачок так і не зразумеўшы, адкуль данесліся гэтыя прыгожыя словы, ўсе ж такі, вырашыў удакладніць:

– Усіх?

– Усіх! – пачуўся адказ.

– І нават Крапіву? – здзіўлена азіраючыся, шэптам спытала Маліна.

– А што я?! Зноў да мяне чапляецеся, – раззлавалася пякучка.

Шэптам, азіраючыся, так і не зразумеўшы пакуль, каму яны ўсе патрэбныя, раслінкі зноў пачалі пералічваць свае крыўды. Убачыўшы гэта, Кабачок рашуча казаў:

– Ціха! Не сварыціся!

У нечанай цішыні ўсе пачулі ціхі голас Рамонка.

– Любіць! Любіць!.. – шчасліва паўтараў ён.

Расправіўшы бялюткія пялесткі, заплюшчыўшы вочкі, радасна ўсміхаўся і цягнуў у блакітнае Неба сваю галоўку. Не звяртаючы ні на што ўвагу, падстаўляў пяшчотным промням Сонца свой твар і ледзь чутна шаптаў:

– Дзякуй табе, Сонейка!

– Чаго гэта ён? – здзіўлена спытала Крапіва ў Кабачка.

– Чаго, чаго! Дзякуе Сонейку – таму, хто нас усіх любіць! – адказаў Кабачок, асцярожна адсунуўся ад пякучкі далей  і дадаў: – І цябе таксама...

І ўсім стала зразумела, адкуль ліліся пяшчотныя словы.

– Сонейка! Яно нас усіх любіць! – усклікнула Маліна.

– Так! Так! – дружна зашамацелі лісткамі раслінкі.

Толькі Крапіва упарта стаяла на сваім:

– Вось яшчэ! Каму гэта любоў патрэбная! І так пражыць можна!

– Патрэбная! І усім! – рашуча адказала Маліна. – Сонейка... яно як Вада, як Зямля і Неба! Хіба мы ўсе без гэтага пражывем?

Сонейка цёплымі промнямі ласкава пагладзіла пякучае лісце Крапівы, што ваяўніча тырчала ва ўсе бакі, і Крапіва сцішылася.

– Э-ээ... Ды што я? Я ж нічога супраць не маю... – прамармытала яна і нечакана для самой сябе, усклікнула: – Глядзіце, які наш Рамонак прыгожы!

Усе паглядзелі на Рамонка...

Сапраўды, які ён быў прыгожы! Яго белая карункавая галоўка адметна вылучалася на блакітным Небе, быццам легкія ветразі нябесных караблікаў сабраліся разам у бязмежнам акіяне, каб плыць далей па вялікім Свеце.

Рамонак дзякаваў за шчырую любоў таму, каму ўсё роўна, колькі ў цябе пялесткаў і якога яны колеру, якога памеру твае лісцейкі, ці есць на табе калючкі.

Рамонак дзякаваў таму, кто любіў яго проста за тое, што ён ёсць... Рамонак дзякаваў за тое, што ён жыве на Зямлі...

На агародчыку стала зусім ціха... Раслінкі дзякавалі за шчырую любоў Аднаго да ўсіх... Кожная па-свойму, не звяртаючы ўвагі на знешняе.

Калі любіш шчыра, кожнай клетачкай аддаваючы цяпло свайго сэрца, хіба важна дзе ты, ці моцна гучаць твае словы? Не...

Калі размаўляюць сэрцам, хіба штосьці можа гэтаму замінаць?..





# Маленькая Хмарка

Маленькая пухнатая Хмарка з самага ранку выцірала Неба і буркатала: «Вунь яно, Неба, якое вялікае... Паспрабуй тут парадак навесці!»

Спынілася на хвілінку, азірнулася: можа, Ветрык даслаў дапамогу? Але на Небе нікога больш не было. Маленькая Хмарка ўздыхнула і зноў узялася за працу.

Сонейка прачнулася, убачыла маленькую Хмарку і павіталася:

– Добрай раніцы!

– Каму якая! – замест прывітання адказала Хмарка і пачала гэтак старанна церці Неба, што, здаецца, яшчэ крыху і – ў ім з'явіцца дзірка.

Сонейка ўсміхнулася і спытала:

– Хіба гэтак цяжка Неба выціраць?

– Яно вялікае, а я – малая, – прабуркатала Хмарка.

– А ты не думай пра гэта, тады лягчэй зробіш патрэбнае.

– Каб дапамог хто! – працягвала буркатаць Хмарка.

Сонейка ўзнялося вышэй на Неба і сказала:

– Калі чакаеш дапамогу, тады першай прыйдзе крыўда, што хтосьці не прыйшоў, а хтосьці спазніўся.

– Цяжка... Працы шмат! – уздыхнула Хмарка.

– Стамілася? – спытала Сонейка і ласкава пагладзіла Хмарку сваім праменьчыкам.

– Ды не... Але усе адно, Неба вялікае, а я малая! Час губляю, свае пасмачкі страчваю! – упарта стаяла на сваім Хмарка.

– Зноў ты за сваё... Паглядзі на мяне, я свае праменьчыкі не шкадую. Усім сваё святло кожны дзень аддаю! – усміхнулася Сонейка і працягвала:
– Тое, што робіш шчыра, заўсёды атрымаецца добра – усім на радасць і цябе таксама. Паглядзі, якім прыгожым стала чыстае Неба!

Хмарка скосу паглядзела на Сонейка, надзьмулася і пырскнула на яго дожджыкам!

Сонейка весёла засмяялася. Кожная кропелька падхапіла яго вумешку…

Дробныя бліскучыя кроплі падалі на Зямлю і стваралі цуда-мост… Вясёлкавы мост паміж Небам і Зямлёй!

Чароўнымі стужкамі ўпляталіся ў яго ўсе колеры Свету: чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы!

Хмарка ў захапленні глядзела навокал і ўжо больш не буркатала… Ды і як можна буркатаць, калі бачыш гэткую прыгажосць?

Яна церушыла дробненькім дожджыкам і разам з Сонейкам радавалася, як вясёлкавыя кроплі нясуць на Зямлю рознакаляровыя падарункі Неба…





# Рознакаляровы Свет

Папера ляжала на стале і уздыхала, паглядаючы на свае бакі.

– Вунь якая я прыгожая! Бялюткая, – з гонарам думала яна. Зірнула на Фарбы, што ляжалі побач, і адсунулася ад іх далей.

– Туляцца тут да мяне... Яшчэ чаго! Ніводнага лістка не дам! – зашамацела яна і адсунулася яшчэ крышачку ўбок. – Кажуць, Папера ўсё сцерпіць. Зараз!

Фарбы, вядома, гэта чулі і таму, ўжо ў які раз, паскардзіліся свайму сябру Пэндзліку, які жыў у адной каробцы з імі:

– Ну вось, зноў пачала. Знайшла чым хваліцца! Што з таго, што белая, калі больш няма на што глядзець? Пустэча!

Папера гэткую абразу без увагі не пакінула:

– Ужо лепей нічагусенькі, чым тыя плямкі, што вы с Пэндзлікам на мне пакідаеце!

– А што? Прыгожа! І ўвогуле, гэта не плямкі, а... – паспрабаваў растлумачыць Пэндзлік, але Папера пачала гэтак гучна галасіць па сваёй згубленай прыгажосці, што, акрамя сябе, нікога больш не чула...

У вакно зазірнуў сонечны Праменьчык. Хацеў было выправіцца далей, але пачуў сварку і спыніўся.

– Дзень добры! – усміхнуўся ён.

Папера ніяк не магла супакоіцца.

– Цярплю... цярплю... – буркатала яна, папраўляючы свае лісткі. Праменьчык паслухаў яе, Фарбы і Пэндзлік, а потым запытаўся:

– Ці ведаеце вы колеры Свету?

– А як жа! Чырвоны, жоўты, сіні... – пачалі Фарбы.

– Зялёны... – падтрымаў Фарбы Пэндзлік.

– Белы! – гучна абвясціла Папера, азірнулася і дадала: – Самы-самы белы!

– Добра... – адказаў Праменьчык. – Гэта толькі назвы, але ў кожным колеры – падарункі Свету. Ведаеце якія?

– Якія? – здівіліся Фарбы і Пэндзлік.

– Не бачу я ніякіх падарункаў! – прамармытала Папера.

– Паглядзіце ў акно... бачыце кветкі? Якога яны колеру? – спытаў Праменьчык.

– Чырвонага! – упеўнена адказалі Фарбы.

– Вось вам і першы падарунак! – усміхнуўся Праменьчык. – Чырвоны колер кахання, дабрыні, пяшчоты... Ён дорыць Свету Любоў.

– А я больш за ўсё люблю парадак і чысціню! – абвясціла Папера.

– Каму гэткая чысціня патрэбная? – здзівіліся Пэндзлік і Фарбы.

Папера скасавурылася і хацела сказаць ім яшчэ нешта, але Праменьчык ветліва спытаў:

– А вунь тыя грыбы ў кошыку якога колеру?

– Вядома, аранжавага! Лісічка сёлета хвалілася, што іх гэтак назвалі ў яе гонар! – адказалі Фарбы.

– Аранжавы колер дорыць радасць ад таго, што спазнаеш Свет, у якім жывеш... – працягваў Праменьчык.

– А чаму, грыбы гэткій колер маюць? Я, напрыклад, не горшая за іх... – зноў пачала было Папера.

– Кожны мае штосьці значнае не дзеля параўнання... – ласкава спыніў яе Праменьчык. – Азірніся... Кожны колер паўсюль нагадвае пра сябе... але яны не трымаюцца паасобку, не крыўдзяць адзін аднаго, а сябруюць. Паглядзі, колькі розных адценняў мае кожны колер. Толькі разам яны робяць Свет прыгожым...

– Я гэта так... крышачку... А ўвогуле... я дзьмухаўцы люблю! – сарамліва зашамацела ліосткамі Папера.

– Як прыгожа гучаць тыя словы, ў якіх няма крыўды. Вось вам і наступны колер – жоўты! Ён, як Сонца, дорыць кожнаму святло гармоніі і радасці, а яшчэ цеплыню ласкавых вусмешак! – усміхнуўся Праменьчык.

Ён зручней уладкаваўся на ўскрайку стала і спытаў у Фарбаў:

– А сіні колер ведаеце?

– Як жа яго не ведаць! – здзівіліся тыя. – Ён такі прыгожы, як само Неба!

– А яшчэ Званочак каля плоту і Матылёк, які ўчора прылятаў, таксама сінія! – задумліва сказала Папера. Яна ўжо не сварылася, а з цікавасцю паглядала ў акно, дзе паказвала свае прыгожае адзенне Лета...

– Сіні колер дорыць Свету мудрасць, безмежную, як глыбіня яснага Неба, узнёсласць думак, свабодных як птушкі... – задумліва працягваў Праменьчык.

– А зялёны будзе? – ціха спытаў Пэндзлік і дадаў: – Дужа ён мне падабаецца...

– А як жа без яго! – ласкава ўсміхнуўся Праменьчык. – Зялёны колер дорыць радасць натхнення... абуджае таленты, якія ёсць у кожнага ў Свеце...

– Вось, вось, я на яго глядзець вельмі люблю і маляваць потым... – падхапіў Пэндзлік і асцярожна паглядзеў на Паперу.

Тая надзіва спакойна ляжала на стале, нават лісткамі не варушыла... Папера слухала.

– А я люблю глядзець, як заходзіць Сонца... – ціха сказала яна, памаўчала крыху, ўздыхнула і дадала: – Толькі ў Фарбаў такога колеру няма.

– Як гэта няма? – здзівіліся тыя. – Калі чырвоны і сіні колеры змяшаць, атрымаецца той самы – фіялетавы!

– Вось вам яшчэ адзін колер! – ласкава усміхнуўся Праменьчык. – Ён дорыць Свету веру і надзею на лепшае.

Праменьчык сядзеў на ўскрайку стала і задумліва паглядаў у далячынь. Надышоў вечар і прынёс з сабою той самы філетавы колер... Папера зноў зашамацела лісткамі і ледзь чутна спытала:

– А-а мой, белы, патрэбны?

– Патрэбны! – адказаў Праменьчык. – Як жа без яго? Дзе яшчэ ўбачыш усе колеры? Толькі на белым...

Папера думала, разважаючы сама з сабою, але зусім нядоўга... Яна пашамацела лісткамі зноў, потым разгарнула іх і сказала Фарбам і Пэндзліку:

– Не шкада! Малюйце свае плямкі!

– Гэта не проста плямкі… – пачаў было Пэндзлік і здзівіўся: ганаровую Паперу было не пазнаць!

– Прабач, я не хацела цябе пакрыўдзіць, – сказала яна і дадала: – Малюйце! Я буду рада…

Праменьчык паглядаў на іх і ласкава ўсміхаўся… Потым узняўся і знік. Вядома, у іх, праменьчыкаў, шмат спраў…

Папера больш не сварылася… Яна пасябравала з Фарбамі і з Пэндзлікам і з таго часу на яе старонках пачалі з’яўляцца малюнкі. Папера ганарыцца імі, лічыць іх цяпер не плямкамі, а сапраўднымі карцінамі. Што на іх намалявана? Свет…

У гэтых карцінах рознымі колерамі зіхаціць яго прыгожосць… Якая? Тая, што заўсёды побач…

Азірніцеся… Прыгажосць нагадвае пра сабе… Чым?

Колерамі…





# Дзьмухавец

Дзьмухавец вельмі хацеў лятаць…

Ён глядзеў на аблокі, якія плывуць па Небе, і ўяўляў іх далёкія вандроўкі па Свеце.

Аблокі заўсёды былі розныя, непадобныя адно на другога: белыя, ружовыя, пухнатыя і важкія, або ледзь бачныя на сінім Небе. Яны нікуды не спяшаліся, а плылі павольна, размаўляючы паміж сабой і з Ветрам.

Здавалася, на вялікім палатне нябачны мастак малюе сюжэты, здзіўляючы сваім талентам усё жывое навокал.

Дзьмухавец вельмі хацеў лятаць…

Вось і сёння, як заўсёды, ён падняў уверх сваю жоўтую галоўку, каб лепей бачыць нябесны шлях аблокаў-вандроўнікаў. «Ізноў цягнеш сваю шыю невядома куды, яна ў цябе зусім стала тонкая і доўгая, – пачуўся ціхі, рыпучы голас. – Састарэеш так са сваёй марай, дзьмухнуць на цябе – і знікнеш, быццам не было».

Дзьмухавец заўважыў сярод зараснікаў хмызняку вялікую тлустую Рапуху. Рапуха насмешліва паглядзела на Дзьмухаўца пукатымі вачыма і, перакуліўшыся праз корчык, схавалася пад ім ад летняй спёкі.

«Ну вось, цяпер яшчэ і Рапуха пачала смяяцца…» – сумна падумаў ён, але галоўку сваю не схаваў, і яна жоўтай плямкай зіхацела сярод зялёнага колеру травы.

«Учора надакучвала нахабная Ліса, а вось сёння – Рапуха, – Дзьмухавец уздыхнуў і задумліва паглядзеў у Неба. – Як добра птушкам, матылькам – ляцяць куды пажадаюць! Я таксама хачу гэтак! Здаецца, зусім трошкі не хапае, каб узляцець у вышыню! Напэўна, там лягчэй дыхаецца і зноў жа, там – бліжэй да Сонца. Вось бы ўзляцець аднойчы, каб адчуць сябе свабодным, убачыўшы зверху Прыгажосць Свету…»

Дзьмухавец вельмі хацеў лятаць...

Невядома адкуль узяўся лёгкі Ветрык і ласкава пагладзіў яго, быццам суцяшаючы ад крыўдных слоў Рапухі... Побач пачулася гудзенне: «Добрай раніцы, прыгожае Сонейка, маленькае Сонейка на нашай Зямлі!»

Дзьмухавец убачыў паласатую Пчолку, якая працавіта збірала пылок з Рамонка. «Добры дзень! – шчыра ўсміхнуўся ён у адказ. – Дзякуй за добрыя словы». Дзьмухавец распушыў галоўку, расправіў лісцікі-рукі і працягнуў іх да сонечных промняў, якія нібыта засталіся ў лабірынце танюткіх трубачак яго кветкі. Сонечныя промні лашчылі, сагравалі кветку, так пяшчотна перабіраючы кожны пялёстак, як толькі маці можа размаўляць са сваім дзіцём.

Дзьмухавец вельмі хацеў лятаць...

На лузе было шмат іншых раслінак. У кожнай з іх свае мары, жаданні, у кожнай – сваё, толькі ёй прызначанае жыццё. Раслінкі сябравалі, іншым часам спрачаліся, але ўсё ж такі паміж імі захоўвалася, толькі ім адным вядомае, таямнічае зялёнае братэрства. Дзьмухавец ведаў, што яго сябар і сусед, блакітны Званочак, ужо даўно закаханы ў Неба, а бялюткі Рамонак, які кожную раніцу лічыць свае пялёсткі, вельмі любіць казкі.

Вось толькі пра сваю мару Дзьмухавец нікому больш не расказваў, трымаў яе ў глыбіні самога сябе, утойваючы ад іншых. Так захоўваюць самую найбольшую каштоўнасць – уласны скарб, які заўсёды надае сілы. Дзьмухавец цягнуў сваю пухнатую галоўку, паглядаючы на аблокі, і яму здавалася, што вось яшчэ крышачку – і ён паляціць разам з імі, лунаючы ў паветры. Лёгкі, празрысты, свабодны...

«Калі вельмі моцна чагосьці жадаць, яно спраўдзіцца», – прыйшлі на ўспамін словы Матылька, які раней часта прылятаў да яго па нектар. А лятаць Дзьмухавец хацеў вельмі моцна... Па начах ён часта бачыў сны аб далёкіх вандроўках, цікавых уражаннях, але галоўным у іх было адчуванне гармоніі, радасці, спакою.

«Калі вельмі моцна чагосьці жадаць, яно абавязкова спраўдзіцца», – зноў успомніліся яму словы Матылька. Дзьмухавец усміхнуўся і агледзеўся...

На лузе віравала жыццё. Кожная жывая істота спяшалася зрабіць усё патрэбнае ёй, а ўвечары паглядзець на далёкія зоркі, адчуваючы, што разам з паўсядзённай мітуснёй ёсць нешта больш значнае ў жыцці.

Дзьмухавец вельмі хацеў лятаць…

Непрыкметна скончыўся дзень, зносячы з сабой у мінулае чараду думак, спраў. Збіралася адпачываць Сонца, перад сном размаляваўшы Неба рознымі адценнямі фарбаў. Настроілі свае інструменты начныя музыкі. Мяккай коўдрай ноч ціха накрыла Зямлю…

Першыя промні Сонца разбудзілі птушак, іх спевы разліліся навокал, разносячы прывітанне новага дня. Туман паступова садзіўся на сцяблінкі, лісце, кветкі раслін, умываў іх, абуджаючы сваёй прахалодай.

– Добры дзень! – павіталася Божая Кароўка, якая уладкавалася побач з Дзьмухаўцом і пачала прасушваць свае маленькія крылцы ад кропелек туману.

– Дзень добры! – ветліва адказаў Дзьмухавец і, кіўнуўшы галоўкай, раптам адчуў незвычайную лёгкасць. Пакуль ён спаў, з ім нешта здарылася… Ён не мог растлумачыць, менавіта што, але зразумеў: за ноч адбылася вельмі значная падзея ў яго жыцці…

Дзьмухавец пацягнуўся да аблокаў на Небе, каб, як звычайна, праводзіць іх у далёкую вандроўку, і пачуў усхваляваны шэпт свайго сябра Званочка:

– Дзьмухавец стаў воблакам! Паглядзіце, паглядзіце! Ён стаў сапраўдным воблакам! – у захапленні паўтараў Званочак, азіраючыся навокал і не знаходзячы такі знаёмы жоўты капялюшык свайго сябра.

– Як прыгожа! Вельмі прыгожа! – ўсхвалявана zakіваў галоўкай  Рамонак.

«Пра што яны?» – здзівіўся Дзьмухавец.

– Добрай раніцы, – прамовіў ён, засаромеўшыйся ад гэткай увагі.

– Добрай раніцы, добрай раніцы! – сіпата перадражніла яго высунуўшаяся з-пад корчыка Рапуха. – Я цябе папярэджвала колькі разоў, але ж ты, разумны, не слухаў. Навошта табе аблокі? Дзьмухне вецер – і няма іх, зніклі! Вось і дачакаўся… сам стаў падобны да іх.

У пукатых вачах Рапухі не было абразы і злосці. Цяжка перакульваючыся з аднаго боку на другі, яна ізноў палезла ў сваю хованку, на развітанне з жалем паглядзеўшы на Дзьмухаўца:

– Ну калі так, добрай табе дарогі... Бывай!

«Чаму яна гэтак гаворыць?» – здзіўлена падумаў Дзьмухавец, але не паспеў нічога адказаць. Раптам наляцеў гарэзливый Ветрык, засмяяўся і... дзьмухнуў!

Незлічоная колькасць маленькіх капялюшыкаў аддарвалася ад галоўкі Дзьмухаўца і ўзнялася ў паветра! Дзесяткі нябесных вандроўнікаў, кожнаму з якіх  ён падараваў уласныя крылы, змаглі-такі здзейсніць яго запаветную мару! Яны... паляцелі!

Танюткія сціплыя капялюшыкі панеслі з сабой насенне – каштоўнейшае багацце, працяг жыцця на Зямлі. Чарговы шэдэўр Прыроды – маленькае яе стварэнне, у якім уся Дасканаласць і Прыгажосць Свету...

Ветрык падхапіў капялюшыкі, і яны, лёгкія, празрыстыя, усе вышэй узнімаліся ў Неба, даганяючы аблокі. Быццам срэбраныя зоркі ў ранішнім Небе, паступова знікалі ў вышыні, каб недзе там, далёка-далёка, стаміўшыся ад доўгай вандроўкі, апусціцца на Зямлю і праз пэўны час ізноў стаць дзьмухаўцамі.

Дзьмухавец вельмі хацеў лятаць...

«Час надыйшоў...» – сказаў Ветрык і пачаў беражна выпраўляць капялюшыкі на Зямлю. Ён ласкава гладзіў маленькіх пухнацікаў, пакідаючы кожнага там, дзе той быў патрэбны... Капялюшыкі гарэзліва перагукваліся паміж сабой і па чарзе спускаліся уніз.

«А вось цяпер і я!» – засмяяўся наступны капялюшык і маленькай зоркай пяляцеў туды, дзе чакала яго тое, што называецца адным вялікім словам Жыццё. Капялюшык апусціўся на Зямлю і агледзіўся... «Як шумна вакол!» – падумаў ён.

Пчолы клапатліва сбіралі пылок з кветак. Абмярковывалі апошнія навіны званочкі. Пераскокваючы адзін праз аднаго, некуды спяшаліся конікі.

Жужаль цягнуў на сабе вялікі кавалак ежы і гучна стагнаў пра тое, як цяжка працаваць на Свеце ім, гаротным жужалям. Яшчарка, грэючы на Сонцы бакі, уважліва паглядала на Матылька, які сядзеў на сцяблінцы і спяваў, бесклапотна разглядаючы сябе в люстэрка кроплі расы.

Пасля прасторы сіняга Неба і белых аблокаў паглядаць на гэта было цікава, крыху нязвыкла і, нават смешна. Капялюшык уздыхнуў і толькі хацеў ўзняцца вышей, як пачуў зусім побач: «Гэй, пухнацік!»

Ён азірнуўся і ўбачыў вялікую зялёную Рапуху.

– Ты хто? – спытала Рапуха і, цяжка перакульваючыся, пасунулася бліжэй.

– Я? Дзьмухавец! – с гонарам адказаў капялюшык, падумаў крыху і упэўненна дадаў: – Я магу лятаць!..





# Старая Яблыня

Старая Яблыня радавалася наступнай раніцы…

Яна не лічыла колькі іх яшчэ будзе: ведала, што ей засталося зусім няшмат, але гэта не надавала апошнім дням сумнага адцення.

«Усе мае», – адказала яна калісьці Сівой Вароне.

Варона задала гэтае пытанне яшчэ узімку. Села на галіну і нахабна запыталася, колькі яна, Яблыня, яшчэ думае тут стаяць і, ўвогуле, ці здолее яна сёлета зацвісці.

За апошнія гады яблыкаў на ёй амаль не было, таму і крыўду на Варону дрэва не трымала. Яблыня разумела, што сіл ёй хопіць ненадоўга. Частка галін ссохлася, ствол, даўно разарваны моцнымі зімовымі маразамі, нахіліўся да самой зямлі…

Вясна надышла халодная, з дажджамі, замаразкамі, сапраўднае цяпло з'явілася вельмі позна. Маладзейшыя суседкі, нейкага заморскага, вельмі каштоўнага гатунку, нават не зацвілі.

Позна ўвечары да яе падышоў Стары Гаспадар: «Састарэла ўжо… зусім як я…» – ласкава пагладзіў яе кару зморшчанымі рукамі і паціху пайшоў у хату. Старыя Яблыня і Гаспадар былі аднаго веку, колькі сябе памяталі, так і раслі побач.

Старых вельмі любілі дзеці…

Яблыню – за яе вельмі смачныя яблыкі, а яшчэ за тое, што на ей было добра сядзець, звесіўшы ногі… колькі таямніц яна ведала!

Гаспадара дзеці любілі за яго незвычайныя цацкі, якія лепш за яго, ніхто зрабіць не мог.

Калі з'явіліся першыя па-сапраўднаму цёплыя дні, Старая Яблыня сабрала ўсе свае апошнія сілы і, балюча адчуваючы духмяністае веснавое паветра, зацвіла!

Яшчэ жывыя галінкі кожнай пупышкай дапамагалі ёй, упрыгожыўшы белым-белым яе састарэлы твар.

Кветкі пышным вэлюмам закрылі счарнелыя галіны і Яблыня, зусім як у маладосці, лёгка гойдала імі.

«Яблыня, старая яблыня зацвіла!» – гаманілі дзеці.

Стары Гаспадар не здзівіўся, а задумліва прамовіў: «Зазбіралася, Прыгажуня…»

Стары Гаспадар нёс на сваіх плячах шмат чаго… Ён даўно жыў адзін, але жыў не адзінока. Хіба можна быць адзінокім, калі ў душы жыве Дабрыня і Любоў?

Напэўна, таму яго цацкі вельмі любілі дзеці… Невялічкія, зробленныя з гліны і высушаныя потым у печы, яны ніколі не былі падобныя паміж сабой не толькі выглядам і афарбоўкай, але і гукамі.

Цацкі старога спявалі…

Гэтак прыгожа! Так спяваюць веснавыя птушкі, вада ў рэчцы, чмель на лузе, вецер у лісці дрэў…

Дзеці і нават дарослыя часам падносілі да вуснаў маленькі камячок з гліны і ў паветра лілася песня…

Кожны спяваў пра сваё, таму і гукі складаліся розныя. У адных – светлыя, радасныя, моцныя, у іншых – балюча-шчымлівыя, сумныя.

Як радасна свяціліся твары у тых, хто спяваў разам з цацкай! Быццам крынічка наталяла іх смагу – так хораша яны размаўлялі з сабою…

Апошнім часам Стары Гаспадар цацак рабіў шмат і, не шкадуючы, шчыра дарыў. Гэтак не шкадуюць свае творы тыя, хто разам з імі аддае цяпло свайго сэрца. Яно крыху стамілася ад пражытых гадоў і усё больш, нагадвала пра гэта, але Гаспадар не хваляваўся: «На ўсе свой час…»

Старая Яблыня цвіла і ведала – апошні…

Смачныя ружовыя яблыкі яна падорыць Гаспадару і ўсім, хто прыйдзе да яе. Яе яблыкі, з танюткімі чырвонымі палоскамі па баках, неслі ў сабе асаблівы водар і смак. Ніхто не ведаў, які гэта гатунак – ва ўсім наваколлі такога больш не было.

Столькі гадоў Старая Яблыня адорвала ўсіх тым, на што багата яна сама, нават калі ёй было ўжо цяжка...

«Зусім ссохнеш, лепш бы расла сабе ў задавальненне – больш пражыла б», – незадаволена паглядала на яе Сівая Варона.

Тое, што аддаешь шчыра нясе Любоў, абуджае пачуцці, з якімі той, хто лічыў сябе слабым, становіцца дужэйшым. Шэрае набывае колер, калі пачынаеш разумець, што побач з паўсядзеннымі турботамі і цяжкасцямі існуе больш значнае – Радасць Жыцця...

Калі бачыш у чалавечых вачах святло шчасця, хіба можна пашкадаваць дзеля гэтага цеплыню свайго сэрца?

Старыя не шкадавалі... Нават ведаючы, што апошняе...

Лета саступіла свае дні Восені. Тонкімі стужкамі пацягнуліся ў Неба птушкі-вандроўнікі. Сонца пакрыла наваколле сваёй пазалотай, і яно зіхацела цяпер ў яго промнях, здзіўляючы багаццем фарбаў. Лёгкае павуціннe ў паветры. Цішыня, толькі зрэдку пачуецца крыштальны крык журавоў...

Старая Яблыня ўздыхнула, паглядзела на свае яшчэ жывыя галіны і ўсміхнулася...

Ружовыя, духмяныя на іх віселі яблыкі... Колькі іх было! Ніхто не памятаў такога яшчэ...

Разумелі: гэта нездарма. Нават дзеці чакалі, пакуль яблыкі даспеюць, не зрываючы іх раней, каб потым, у пэўны час, беражліва патрымаць у сваіх далонях цуд натхнення...

Стары Гаспадар скончыў сваю апошнюю цацку-падарунак...

Цацка атрымалася вельмі хутка і неяк па-асабліваму прыгожа...

Так заўсёды бывае, калі побач узнесласць.

Ён падорыць яе таму маленькаму звонкагалосаму хлопчыку, які учора прыбягаў да яго.

Уздыхнуў...

Крыху адпачыць бы...

Пайшоў да Яблыні, сеў, прытуліўся да яе спіной.

Старыя былі разам…

Колькі ім засталося? Яны не лічылі час…

Не думалі аб тым, што будзе заўтра і ці будзе яно ўвогуле.

Яны глядзелі, як заходзіць Сонца і, ўжо ў каторы раз, здзіўляліся гэтаму…





# Маленькая Сняжынка

Белая Хмарка зазірнула ў сваю кішэню і ўбачыла там апошнюю Сняжынку...

– Як гэта я цябе не заўважыла? – здзівілася Белая Хмарка.

Кішэня была вялікая... Апошняя маленькая Сняжынка ціхенька сядзела ў самым куточку і не рухалася. Хмарка паглядзела ўніз на Зямлю і спытала:

– Чаму ты тут схавалася? Твае сяброўкі, вунь ужо дзе! А ты не спяшаешся...Чаму?

Маленькая Сняжынка прыціснулася да мяккай кішэні і ціха сказала:

– Не хачу! Мне тут добра! З табой.

Белая Хмарка пагойдалася ў Небе:

– Усе калісьці выпраўляюцца ў свае падарожжа... Надыйшоў і твой час таксама.

– Я не ведаю, якое яно, маё падарожжа?

– Калі ты робіш добрыя справы, яно будзе добрым.

– Я ж маленькая зусім! Хіба я штосьці магу? – няўпэўнена азіраючыся, спытала Сняжынка.

– Можаш! З маленькіх спраў складаюцца вялікія. Галоўнае – каб іх рабілі шчыра! – сказала Белая Хмарка, асцярожна дастала апошнюю Сняжынку са сваей кішэні і падняла яе вышэй: – Глядзі!

Маленькая Сняжынка ўбачыла далёка ўнізе Зямлю... Там ў чароўным танцы лёгка кружыліся гэткія ж маленькія сняжынкі. Падобныя на яе і разам з тым не зусім... У кожнай свой непаўторны, вытанчаны крыштальны малюнак.

Сняжынкі прыгожа зіхацелі на Сонцы, ціха апускаліся на Зямлю, ствараючы  вялікую белую коўдру. Пяшчотна пакрывалі ўсе яе куточкі, каб зберагчы ад маразоў усе жывое.

– А што будзе потым? – спытала маленькая Сняжынка, паглядаючы то на Белую Хмарку, то ўніз, на Зямлю, якая таксама стала зусім белай.

– Зямля стане дужэйшай. Адпачне Зімой, а Вясной прачнецца і падорыць усім Радасць Жыцця.

– А дзе будзем мы, сняжынкі?

– Вернецеся да мяне кропелькамі вады і праз некаторы час зноў станеце сняжынкамі.

– І гэтак будзе заўсёды?

– Так... заўседы! – адказала Белая Хмарка.

Апошняя Сняжынка пасядзела яшчэ крышачку на ўскрайку кішэні, прыціскаючыся да мяккай пухнатай Белай Хмаркі, а потым адарвалася і паляцела...

У зімовым халодным паветры кружылася маленькая бліскучая прыгажуня. Усе ніжэй апускалася на Зямлю, даганяючы сваіх сяброўак, каб разам з імі зрабіць яе, Зямлю, дужэйшай...





# Дзень
# Нараджэння Лесу

Жыў на Зямлі Лес. Колькі яму гадоў, Лес не памятаў. Пра гэта нават не ведаў ніхто з яго жыхароў: усё адбылося вельмі даўно. Сам Лес пра гэта таксама ніколі не думаў: проста жыў – і ўсё.

Лес любіў Сонца. Адчуваў яго свет і цяпло, радасна цягнуў у вышыню свае рукі-галіны. Лес дзякаваў Сонцу за тое, што яно ёсць на Небе. Сонца любіла Лес, кожны дзень віталася з ім, кранаючы сваімі праменьчыкамі.

Лес жыў у безупынным кругазвароце часу. Звонка спявая галасамі птушак, абуджаўся Вясною. Дыхаў водарам кветак і мёду Летам. Шчыра адорваў усіх сваімі скарбамі Восенню, а потым, крыху стомлены, адпачываў. Зіма ўхутвала яго мяккай белай коўдрай, і Лес засынаў, каб у пэўны час прачнуцца і зноў уступіць ў такі знаёмы кругазварот: Вясна, Лета, Восень, Зіма.

Жыла на Свеце маладзенькая пухнатая Хмарка. Яна нарадзілася зусім нядаўна, была па-дзіцячаму гарэзлівая, нават крыху свавольная. Хмарку цікавіла ўсе, што адбывалася вакол. А яшчэ яна любіла бегаць па Небе з Ветрыкам. Яе бабуля, старая важкая Хмара, гледзячы на іх, не злавалася, а толькі буркатала час ад часу: «Няма на вас супынку!»

Аднойчы Хмарка набегалася па Небе і стамілася. Таму яна прытулілася да вялікай Сасны, што расла на ўзгорку і вырашыла адпачыць.

Лес заўважыў Хмарку ранкам. Маленькая гарэза соладка спала на галіне Сасны і нават не варушылася. Лес усміхнуўся, убачыўшы, як пяшчотна Сасна прыкрыла пухнатую вандроўніцу ад начной прахалоды. Лес пырснуў кроплямі расы на абодвух, і яны прачнуліся.

– Навошта нас турбуеш? – запыталася Хмарка.

– Дзень пачаўся, хопіць спаць! – засмяяўся Лес.

– А я яшчэ маленькая, тры дні як нарадзілася.

Хмарка спачатку схавалася пад галінай, але потым высунулася. Уладкавалася наверсе Сасны і спытала:

– А калі нарадзіўся ты? Калі твой Дзень Нараджэння?

Лес разгубіўся:

– Не ведаю. У мяне яго няма...

– Як гэта няма? – звярнулася Хмарка да Сасны.

Тая сарамліва апусціла галіны і ўздыхнула:

– Ніхто не ведае. Даўно гэта было...

– Свой Дзень Нараджэння трэба ведаць! – рашуча прамовіла Хмарка і азірнулася...

Пачынаўся новы дзень, і Сонца зноў узялося за свае справы: песціла, прычэсвала, саграваала, высушвала. Хмарка паклікала Ветрыка. Яны пашапталіся аб нечым, і той хутка знік – быццам яго і не было.

Хмарка ўзнялася ў Неба вышэй і абвясціла:

– А ці ведаеце вы, што сёння ў нашага Леса Дзень Нараджэння?

Гэтая аб'ява была настолькі нечаканай, што ў Лесе стала ціха. Напэўна, упершыню яго жыхары задумаліся пра тое, калі з'явіўся у Свет той, хто заўсёды быў надзейным сябрам.

– У мяне? – здзіўлена прашаптаў Лес.

– У цябе! – засмяялася Хмарка.

На блакітным Небе, падштурхоўваючы перад сабой старую Важкую Хмару, з'явіўся Ветрык. Тая незадаволена бурчала, але маленькая Хмарка крыху пашапталася з ёю, і Лес адчуў, як цёплы ласкавы дождж сыплецца на яго зверху.

Дробныя празрыстыя кроплі вады падалі з Неба, скакалі па зялёных прыступках лістоты, спускаючыся ўсё ніжэй да Зямлі. Сонца засмяялася, і яго вусмешка заблішчэла ў гэтых кроплях, весела пераліваючыся рознымі колерамі...

– Глядзіце, глядзіце! Нашаму Лесу на Дзень Нараджэння падарылі Вясёлку! – загаманілі яго жыхары.

– Дзівосная з'ява! Я бачыла раней, але каб яе падаравалі на ўласнае свята!

Які каштоўны падарунак! – у захапленні прамовіла Сасна.

Яе падтрымаў Ветрык:

– Тое, што робіцца шчыра, ад усяго сэрца – самае каштоўнае.

– Дзякуй вам за віншаванне, але я, прабачце, не памятаю ўвогуле ці ёсць такі дзень у мяне? – сціпла ўсміхнуўся Лес.

Цяпер будзе! – адказала старая Важкая Хмара, злёгку пыхкаючы ад уласнага цяжару.

– Дзень Нараджэння павінен быць у кожнага! – падвяла вынік размове маленькая Хмарка.

І раптам усім стала зразумела: Хмарка кажа праўду! Маладзенькая, па-дзіцячы пухнатая гарэза кажа тое, што вельмі важна было і будзе заўседы. Калі ёсць Жыццё на Свеце, яно павінна некалі нарадзіцца. У кожнага ёсць Свята Нараджэння на Свет...

Свята і Жыццё аднолькава радасныя, адно без другога існаваць не могуць. Няважна, калі і дзе ты нарадзіўся: галоўнае, што гэта адбылося...





# Шпак і Значнасць

Шпак хадзіў па дарожцы, час ад часу паглядаючы па баках...

Важна злажыўшы за спіной крылы, выкідваў уперад тонкія худыя лапкі і напружана думаў толькі пра адно: «Ці значна я выглядаю?»

Спатыкнуўся аб дажджавога чарвяка, паглядзеў на яго, уздыхнуў: «Трэба нешта з'есці» – і...пайшоў далей. Чарвяк спачатку самлеў ад жаху, што яго з'ядуць, але потым апамятаўся і, хуценька саслізнуўшы з дарожкі, папоўз хавацца ў мяккую пасля дождыка глебу.

Суседзі-сітаўкі ўбачыўшы гэта, засмяяліся, але Шпак, задзёршы дзюбу, нікога не бачыў... акрамя сябе. Так-так! Захапляўся самім сабой, уяўляючы сябе з усіх бакоў. Вось толькі апошнім часам Шпак усе больш хваляваўся: «Ці дастатковая мая значнасць?»

Калі гэтае пытанне пачало муляць яму галаву штодзённай думкай, ён выйшаў на дарожку і пачаў хадзіць па ёй узад-уперад, чакаючы, што нехта са знаёмых, а можа, і незнаёмых скажа нешта прыемнае.

«Вось, калі ўзняць галаву вышэй, а дзюбу звярнуць крышачку ўбок, будзе зусім добра. Нічога, што нязручна, затое так, як я, ніхто не ходзіць», – разважаў ён, час ад часу спатыкаючыся аб каменьчыкі на дарожцы.

Шпак даходзіў да высокага чароту, што рос на беразе сажалкі, а потым, шыкоўна крутануўшыся на адной лапцы, паварочваў назад. Колькі разоў паўтаралася гэтае практыкаванне, ён не лічыў, толькі ўсё тупаў і чакаў, калі яго нарэшце заўважаць. Але чамусьці ніхто на яго не паглядаў.

Усе некуды спяшаліся...

«Вунь, зараз Жужаль абавязкова зверне на мяне ўвагу. Бяжыць менавіта ў мой бок. Задзяру дзюбу вышэй, нават і не павітаюся... Калі пакрыўдзіцца, скажу: няма калі, шмат спраў маю!» – падумаў Шпак і сапраўды яшчэ вышэй задзёр сваю дзюбу.

Жужаль  павітаўся, але ён гэтак так хутка некуды бег, што нічога не заўважыў. Сустрэўся знаёмы Жаўрук , які нёс нешта смачнае. Ён зірнуў на Шпака і, нічога не кажучы, паляцеў у вышыню. «Трэба ж нешта з'есці», – зноў падумаў Шпак, уздыхнуў і... крочыў далей.

– Не стаміўся? – пачуўся з чароту нечы голас. Ад нечаканасці Шпак спатыкнуўся і сеў на дарожцы. Тонкія, худзенькія лапкі з шурпатымі каленькамі смешна выцягнуліся ўперад. Зразумеўшы, што выгляд зараз у яго зусім ня значны, Шпак задзёр дзюбу яшчэ вышэй і, нават не павярнуўшы галавы, запытаўся:

– Вы маеце да мяне нейкую размову?

– «Маеце», «да мяне?!» – перакрывіў яго нехта з зарасніку. – Нічога я да цябе не маю, я дзетак сваіх пільную. Але ж ты ўжо колькі разоў тут праходзіш. Спачатку падалося, што згубіў нешта, можа, дапамагчы трэба, але ж гляджу – не... хіба згубленае гэтак шукаюць?

З чароту высунуўся востры нос Вадзянога Пацука.

– Нашто губляеш час дарма? – насмешліва пацікавіўся ён.

Ад нечаканасці Шпак апусціў дзюбу і, лыпаючы вачыма, паглядзеў на суразмоўцу, не ведаючы што адказаць. Але потым зноў успомніў пра сваю значнасць, падняўся і, закінуўшы за спіну крылы, пакрочыў далей.

– Чаго гэта ён? – запыталася ў Пацука Сарока.

– А табе ўсе трэба ведаць! Толькі і кормішся навінамі з ранку да вечара! – забурчаў Пацук.

– А-а-а, усё! Я ўжо ўсё зразумела! – упэўнена затрашчала Сарока і заспяшалася: – Ну, добра... бывай!

– Нічога ты не зразумела! – крыкнуў наўздагон Пацук, але тая была далёка.

Сонейка напоўніла дзень спякотай. Шпак стаміўся і сеў на бярозу.

– Глядзі, глядзі... Шпак! Сарока казала, што Шпак думае аб нечым вельмі значным! – пачуўся шэпт зверху.

Шпак з асалодай прыслухаўся: «О-о-о... Вось нарэшце і дачакаўся! Гэта ж пра мяне...»

Побач на галіне размаўлялі паміж сабою дзве сінічкі.

– А што бывае значным? – запыталася меньшая сінічка ў большай. Большая крыху памаўчала, а потым адказала:

– Тое, што патрэбна ўсім...

– І мне таксама?

– Так.

– А ці хопіць яго на ўсіх?

Большая засмяялася:

– Хіба на ўсіх не хопіць Сонейка, Неба... Зямлі?

– Гэта і ёсць самае значнае?

– Так... Яшчэ ёсць Любоў.

– А яе ўсім таксама хапае ?

Большая сінічка зноў засмяялася і ласкава сказала:

– Любоў вымераць нельга. Яна бязмежная.

Сінічкі паляцелі. Толькі Ветрык злёгку гойдаў галінамі, быццам згаджаўся: «Так, так, так...»

Шпак сядзеў на бярозе і думаў пра... значнасць. Толькі цяпер для яго яна стала іншай... Шпак успомніў, як добра бачыць са свайго дамка раніцу... Якое прыгожае Неба, Сонейка. Як добра ляцець дамоў і ведаць, што цябе там чакаюць...

«Няўжо без гэтага можна? Не...» – разважаў ён.

Адзін за другім прыходзілі прыгожыя ўспаміны. Іх было так шмат, што, здаецца, дня не хопіць, каб расказаць усё... І чым больш нагадваў – тым меньш значным падавалася яму тое, як ён выглядае знешне.

Калі бачыш у жыцці не толькі сябе, толькі тады заўважыш тое, што існуе навокал...

Шпак паглядзеў на свае худыя лапкі з шурпатымі каленькамі і ўсміхнуўся: «Дзівак, колькі часу страціў...»

Побач з шумам апусцілася Сарока:

– Як твая галава? – спыталася яна і, не дачакаўшыся адказу, без перапынку загаманіла далей: – Усе цікавяцца, пра што ты увесь час думаеш!

Шпак паспачуваў:

– Стамілася пэўна?

Сарока падазрона нахіліла галаву, паглядзела: смяецца ці не? Але цікавасць была мацнейшая, таму яна не стрымалася:

– Не вельмі, але… Да чаго ты дайшоў?

– Дайшоў? Да… значнасці…

Сарока здзіўлена пакруціла галавой і спытала:

– Якой?

Яны доўга разважалі, то згаджаючыся, то ўступаючы ў спрэчку. Сонца схавалася за верхавіны дрэў і забрала з сабою дзённую спякоту. Шпак і Сарока сядзелі на галіне і вырашалі для сябе пытанні, сапраўды значныя для кожнага, хто калісьці задае іх сабе ў жыцці…

Ветрык, злёгку гойдаў галінамі, слухаў іх і быццам згаджаўся: «Так, так, так…»





# Неабыякавы Парсючок

Неабыякавы Парсючок паўсюль соваў свой цікаўны нос…

Нос у яго быў сапраўды цікаўны. Нават носам назваць яго, на самой справе, было цяжка. Гузік! Так, так ! Гузік, з маленькімі дзвюма дзірачкамі!

Вось гэты гузічак заўседы з'яўляўся менавіта там, дзе яго не чакалі. Каб толькі з'яўляўся – яшчэ дробязь, але разам з ім з'яўляліся пытанні, якіх у Парсючка было вельмі шмат. Напэўна таму і не хапала на іх адказаў.

Парсючок ужо ўсім надакучыў сваімі «Чаму?» і «Навошта?», але больш за ўсіх надакучыў ганарліваму Індыку. Индык здаўна меў на Парсючка крыўду…

«Чаму ў цябе, дзяцька, замест носу даўжэзная шкарпэтка вісіць?» – спытаў неяк у яго Парсючок, і з таго часу да Індыка па-іншаму ніхто і не звяртаўся.

З самага ранку Парсючок не мог знайсці адказ на вельмі важнае пытанне: «Навошта мне такі нос?»

Калі ён запытаў аб гэтым Індыка, той з'едліва ўсміхнуўся і адказаў:

– Каб добра бачыць…

– Што бачыць? – не зразумеў Парсючок.

Індык памаўчаў крышачку і потым дадаў:

– Каб заўважыць тое, што не бачаць іншыя, трэба капаць глыбей. Хто на гэта здольны, той самы разумны.

Як толькі Парсючок пачуў слова «разумны», у яго недзе там, у страўніку, стала вельмі соладка… Ён нават уздыхнуў, нагадаўшы, што менавіта гэтак ласкава назвае яго Гаспадыня, калі прыносіць ежу. Ён яшчэ раз уздыхнуў і, адчуўшы цяжар уласнай значнасці, з дрыжыкамі ў голасе ўдакладніў:

– А-а… дзе капаць?

Індык азірнуўся вакол і кіўнуў галавой:

– Паўсюль!

– Як... паўсюль? – здзівіўся Парсючок.

– А вось так... – лагодна працягваў Індык. Толькі маленькія яго вочкі з'едліва блішчэлі, паглядаючы на цікаўнага Парсючка.

Той агледзеўся і зноў спытаў:

– А дзе лепей за ўсё?

Індык крыху падумаў і дадаў:

– Там дзе бываюць усе, але ніхто з іх не заўважыць тое, што можашь знайсці толькі ты.

– А якое яно? – здзіўлена прашаптаў Парсючок.

– Не ведаю! Я ж не маю такога носа як у цябе! Да таго ж у мяне, як ты казаў, замест носу вісіць «шкарпэтка».

Індык з агідаю прамовіў гэтае слова, але, пэўна, нездарма, бо пасля гэткай шчырай парады Парсючка ўжо на месцы не было...

Калі праз некаторы час Гаспадыня выйшла на падворак, яго было не пазнаць! Раўнюткімі сцяжынкамі цягнуліся зробленыя Парсючком ямкі! Тое, што здарылася каля плота, і ўвогуле нельга ацаніць!

Гаспадыня войкнула і села на ганак, абхапіўшы галаву рукамі. Парсючок краем вока гэта бачыў... «Гэта яна ў захапленні ад майго розуму!» – падумаў ён. Таму працу не спыніў, а наадварот, з большым імпэтам узараў сваім носам-гузікам лапік мяккай зямлі перад самым ганкам.

Нешта свіснула, і Парсючок адчуў, як запякло там, дзе хвосцік... Не так балюча, як крыўдна. Цікаўны Парсючок не зразумеў, чаму яму не дазволілі паказаць усім, які ён разумны. Ні ў кога ж такіх выдатных гузікаў няма! Ён гэтак старанна паказваў свае здольнасці, а яму нават не падзякавалі за зробленую працу...

Хвосцік крыху павіс. Парсючок спыніўся: «Каб мяне хаця б паслухалі!» Але убачыў раз'юшаны позірк Гаспадыні, азірнуўся на свой хвосцік і пайшоў да свайго хлеўчука...

«Дарэмна! Нікому мой розум не патрэбны!» – думаў ён. Сумна апусціў вушкі і, пераскокваючы праз свае ямкі, пасунуўся прэч...

Індык, задаволена паглядаючы на Парсючка, выцягнуў уперад сваю «шкарпэтку» і прашыпеў: «Ну-у што, атрымаў падзяку, Гузічак?»

Індык заплюшчыў вочы, чакаючы ціхенькага і разгубленага вохкання, але… нічога не пачуў!

Парсючок мінуў Індыка, мінуў свой хляўчук і… пайшоў далей. Сеў на ўзгорку і падставіў падрапаны носік-гузік цёпламу Сонейку. Проста сядзеў і грэўся… А потым падумаў: «Калі ў мяне ёсць нос, якім вельмі зручна капаць – ён павінен нешта знайсці… Цікавае. Разумнае. Інакш навошта ён з’явіўся ў мяне такі?»

Хвосцік яшчэ крыху пабольваў, але ў страўніку ад думкі пра уласную разумнасць ўжо не станавілася соладка. Ды і цяжар ад уласнай значнасці таксама знік. Таму стала лягчэй. Пагрэўшыся яшчэ крыху на Сонейку, Парсючок пайшоў капаць далей. Дзе? Там, дзе цікава…





# Курка
# і Залатое Яйка

Курка знесла яйка! Чарговае...

Азірнулася – зноў простае, не залатое. Чакала, што сёння ў яе абавязкова з'явіцца залатое. Будзе зіхацець на ўвесь хляўчук... І вось! Самае звычайнае, крыху жоўтенькае, з маленькімі плямкамі па баках. Курка паглядзела ў суседскае кубло і ўздыхнула: «Як ва ўсіх...»

Ісці на падворак не хацелася – занадта шумна там. Села ў хлеўчуку каля маленькага акенца, заплюшчыла вочы і сціхла. Курка марыла пра тое, як яна знясе залатое яйка. Тое, запаветнае... Вельмі жадала знесці, але пакуль усё дарэмна.

«Знясу яйка і адразу стану знакамітай», – з асалодай думала Курка, ўяўляючы сябе ў прыгожым куратніку. «Дзе там куратніку – у палацы! Ніяк не менш! Яйка ж будзе залатое! Толькі палац! Каб нават ежа сама ў дзюбу сыпалася – толькі адчыняй! Вось гэта жыццё...» Курка гэтак захапілася ўласнымі марамі, што заснула... Вядома, птушкі спяць седзячы, а Курка хіба не птушка?

І сніцца Курачцы незвычайны сон... Быццам прыйшла да яе Гаспадыня і прынесла не каму-небудзь, а менавіта ёй, Курачцы Рабцы, зерне. Зерне тое незвычайнае – залатое. Вялікае...Зіхаціць, пераліваецца, ажно вочы баляць на яго гледзячы.

«Вось, – кажа Гаспадыня, – як з'ясі ўсё гэтае зерне, пачнеш несці залатыя яйкі. Я тыя яйкі на кірмаш знясу і прадам. За тое і куплю табе ў падарунак прыгожую клетку. Сапраўдны палац – тая клетка. Вада ў сподачку, зерне ў дзюбу сыплецца – толькі адчыняй! Нават кветка ў гаршочку расце... Будзеш жыць у ёй як сапраўдная пані».

Узрадавалася Курка, засакатала, быццам дзесятак гэткіх яек ужо Гаспадыні ў кошык палажыла і... прачнулася.

Агледзелася – тое, што і раней было: той жа хляўчук, акенца маленькае. Уздыхнула, хацела ўжо на падворак вылезці, але бачыць – у куточку блішчыць нешта... Золатам зіхаціць! Сэрца курынае закалацілася... Ледзь падыйшла да таго месца – гэткае хваляванне надыйшло! Бачыць: зерне! Залатое! Вялікае! Ляжыць у куточку! Адкуль толькі з'явілася?

Узгадала Курка сон і пачала есці. Дзяўбе, шчыруе, хаця б не засталося каму! Азірнецца па баках – і зноў. Толькі дзюба мільгаціць... Хвілінкі не прайшло, а зерня ўжо няма! Быццам не было! З'ела. Ледзь упхнула. Апошнія зярняткі набрала ў дзюбу. Хаця б не заўважыў хто!

Ісці трэба... Вунь ужо Гаспадыня кліча – пэўна, шукае. Выйшла на падворак, бачыць: усе куркі таксама ядуць, толькі зерне ў іх звычайнае... «Не-е, – думае, – я цяпер да яго і не дакрануся! Нікому нічога не скажу! Буду чакаць, пакуль у мяне залатыя яйкі не з'явяцца!» Надзьмулася і пайшла бокам. Ледзь клыпае... Цяжкавата: зерне вялікае, ды і з'ела зашмат, таго і глядзі пасыплецца з дзюбы. «Нікому нічога не скажу, – думае, – буду яйкі несці, якіх ні ў кога няма. Пабудуюць мне палац, як сапраўднай пані».

«Нешта Курка Рабка есці не хоча, – думала Гаспадыня, ўважліва назіраючы за Куркай. – Мо захварэла?»

«Гэта яна мае залатыя яйкі чакае, лічыць, якога памеру будуць, ці добра яна іх на кірмашы прадасць! – у сваю чаргу, думала Курка, цяжка кульгаючы ў бок хлеўчука. – Вось сяду дзе-небудзь у куточку і буду чакаць свайго часу... Крышачку зашмат з'ела. Але ж не пакідаць яшчэ каму. Няхай ужо ў дзюбе паляжыць, потым паціху ўтрасецца».

Села каля акенца, уздыхнула і зноў пачала марыць: «Буду жыць у палацы. Калі яйкі будуць вялікія – няхай пабудуюць для мяне палац таксама вялікі. Так-так! Каб кубло з дыванамі, ды музыкі гралі, калі я яйкі несці буду... Вядома ж, яйкі таго каштуюць!»

Але, напэўна, Курка з'ела сапраўды зашмат, трымацца на жэрдцы было нязручна, ды і дыхаць цяжкавата. Зерне чамусьці не правальвалася некуды ўніз, як раней. Часам было такое: з'ясі крыху зашмат – з кім не бывае... Але неяк уладкоўвалася пацiхупацiху ў страўніку... А гэтае – не, засела недзе

пасярэдзіне, нават выпіралася наперад шурпатымі камякамі.

«Нічога, – думала Рабка, – пацярплю, вядома ж, зерне залатое. Не якое-небудзь!» Цяжка паварушылася і ўжо было задрамала зноў, як пачула зусім побач раз'юшаны лямант: «Колькі дзён тыя зярняткі хаваў, а тут аніводнага няма!»

Курка Рабка ледзь не звалілася ўніз! Учапілася, што было моцы за жэрдку і сядзела не варушылася...

У тым самым куточку, дзе блішчэла куркіна залатое зерне цяпер сядзеў шэры Пацук. Ляпаў у адчаі кароценькімі лапкамі па тлустаму жывоціку і галасіў.

«Колькі працаваў! Начэй недасынаў! Колькі пачаткаў кукурузы сцягнуў, патрушчыў, злажыў! Толькі на гадзінку выйшаў – няма! Колькі працы, колькі працы!» – лямантаваў ён, абхапіўшы галаву лапкамі.

Курка паглядзела зверху на Пацука і тое зерне, што яна з'ела, здаецца, яшчэ крышачку – пасыплецца ўніз. «Як жа ён, гаротны, пакутуе! – падумала яна, чапляючыся за жэрдку мацней. – Вось як у жыцці бывае: аднаму пашанцуе, а іншаму... У мяне – палац неўзабаве, а некаму есці няма чаго...»

Курка хацела было паспачуваць Пацуку – ды дзе там! Зерне падпірала дзюбу.

Пацук тым часам шкадаваў сябе сам.

«Вунь Восень зараз, Зіма неўзабаве, як жа мне? З голаду памру! – усё мацней лямантаваў ён. – А зерне! Якое ж зерне назапасіў! Быццам залатое!»

Як толькі Курка Рабка пачула словы пра залатое зерне, у яе, здаецца, на першы погляд, не гэткай ужо і разумнай, галаве ўсе неяк хутка стала на сваё месца...

З гучным «Ку-ды мне гэтую ку-ку-ру-зу!» выляцела Рабка на падворак і пабегла! Куды? Не ведала... Але, мабыць, з жаху або з сораму тое зерне разгубілася па дарозе.

Доўга бегала Рабка. І стала лягчэй...

Магчыма таму, што не ціснуў цяжар залатога і бліскучага, якое гэтак шкада згубіць.

Або таму, што пакуль бегала па наваколлі, зразумела: ніводны самый прыгожы палац не заменіць адчування з якім бежыш па лузе...

Няхай толькі бяжыш, а не ляціш па Небе, няхай нават з рэшткамі цяжару ў страўніку. Усе ж такі яна – птушка...

Курка знесла чарговае яйка... Раўнюткае, жоўтенькае, з маленькімі плямкамі па баках. Не залатое... Навошта яно ёй?

Са згубленага зерня дзе-нідзе Вясной вырасла высокая кукуруза, здзіўляючы Гаспадыню: чаму яна тут з’явілася?..





# Певень і Гадзіннік

Певень учоры згубіў гадзіннік.

Гэткі прыгожы! Маленькі, зграбненькі, з дзвюма бліскучымі палачкамі і шыкоўнай шапачкай зверху. Заўседы быў пад крылом – і вось знік! Няма...

На самай справе Певень добра ведаў, калі трэба прачынацца, калі класціся спаць. У гаспадарцы яго паважалі. За дакладнасць...

Вядома, на кожную справу – свой час. Певень нагадваў усім пра гэта і яшчэ пра тое, што час ідзе вельмі хутка і таму трэба берагчы кожнае яго імгненне. Гэта вызначыў ён сам, назіраючы, як шпарка рухаюцца палачкі па крузе. Певень не вельмі разумеў, навошта яны патрэбныя, але тое, што менавіта разам з імі, палачкамі, ідзе час адчуваў...

«Дзе цяпер мой гадзіннічак? Ці здольны ён цяпер лічыць час? А што, калі не? – Певень разгублена абвёў позіркам гаспадарчы двор і ўздыхнуў: – Добры быў гадзіннічак... А як прыемна было яго даставаць! Асабліва калі нахіліць ўбок галаву, паглядзець няспешна на бялюткі кружочак з акуратненькімі плямкамі, а потым выцягнуць шыю, заплюшчыць вочы і... «Ку-ка-рэ-ку!» Непараўнальна...»

І вось гадзіннік знік. Няма! З самага ранку Певень абышоў увесь двор, шукаў нават у гнездах... Знік! Сорамна... Згубіць гэткую каштоўнасць! Певень з вечара рабіў выгляд, што нічога не здарылася. Хадзіў, адтапырыўшы правае крыло, быццам там, як заўседы, гадзіннік.

«Дзе я мог яго згубіць? Здаецца, і не надта штурхаўся ля карытца з ежай... Запытацца ў кур? Не, няма сэнсу, – думаў Певень, крочачы па падворку ўзад-уперад. – Падымуць лямант «Ку-ды, ку-ды!» Не-е... Лепей сам!»

Певень адышоў крыху ўбок і пачаў уважліва прыглядацца да жыхароў гаспадаркі. Тыя на Пеўня асаблівай увагі не звярталі, займаліся паўсядзеннымі справамі.

«Мітусяцца, ніякіх іншых клопатаў не маюць!» – уздыхнуў Певень. Сумныя думкі пакідалі ў галаве неспакой...

«Я ж павінен сачыць за часам, а гадзінніка няма: Няўжо ўкралі!? А што? Гэткі прыгожы! – Певень падазронна азірнуўся. – Вунь тая тлустая Качка заўсёды спазняецца, пэўна ёй часу не хапае. І Казёл нейк па-іншаму паглядае. Звычайна проста стаіць, паказеліўшы вочы, а сёння... Курка Рабка некуды знікла. Няўжо ж да гэтага часу яйка не знесла? Спазнілася...»

Певень, як звычайна, скасавурыўся ў бок крыла, дзе заўседы была яго ўласная каштоўнасць – гадзіннічак. І зноў успомніў: няма! Аж да самага хваста пабеглі дрыжыкі... «А што, калі яго, гадзіннічак не проста ўкралі, а яшчэ зламалі тыя палачкі і час спыніўся?! Усё! Так і ёсць – укралі!» – канчаткова вырашыў Певень.

Адчуванне ўласнай адказнасці узмацняе кожнага... Здавалася, нішто на Свеце не можа перашкаджаць яму, Пеўню, цяпер знайсці згублены час і вярнуць яго ўсім. Певень рашуча ўскінуў галаву: «Знайду! Абавязкова! Куды б яго не схавалі!» Азірнуўся. Падскочыў раз, другі... Азірнуўся зноў, крыху падумаў і, задзершы хвост, пабег да вялікага сметніка...

Як вылятаюць кавалкі струхнелай саломы, рэшткі зеляніны і яшчэ нешта, было бачна здалёк. Насельніцтва гаспадаркі спачатку не звяртала на гэта ніякай увагі, потым пачало прыглядацца, пытаючыся адзін у аднаго: ”Што гэта, Пеўню, там трэба?” Ніхто не ведаў...

Свіння, негледзячы на ляцеўшыя ў яе бок камякі смецця, падыйшла бліжэй і паспачувала: «Цяжка? Мо дапамагчы? Я ў гэткіх справах вопыт маю!» Але Певень не чуў, шчыра капаў, шукаючы згубленае, – толькі лапкі мільгалі. Гэта было цікавае відовішча!

Паступова да сметніка было ўжо не прапхнуцца. Усе стаялі побач і здзіўляліся: «Паважаная птушка і вось табе...»

Гадзінніка не было...

Певень стаміўся, брудны грэбень споўз на вочы. Спыніўся нарэшце, сеў на тое, што было кучей смецця, і азірнуўся. Убачыў вакол шмат гледачоў і хацеў было ўцячы спачатку, але ўзгадаў пра сваю адказнасць за час,

і ўздыхнуў: «Трэба сказаць ім праўду пра тое, што часу цяпер няма, што ён, Певень, учоры згубіў яго невядома дзе, ды не здолеў знайсці!»

Певень адкрыў было дзюбу, ды не паспеў: паўз тлустую Качку адзін за другім да яго выкаціліся кураняткі.

Маленькія жоўценькія пухнацікі ледзь цягнулі за сабою на тонкім ланцужку нешта пыльнае. «А мы, а мы... твой гадзіннік знайшлі!» – ледзь дыхаючы ад хуткага бегу, прамовіў адзін. «Ад нахабнай Сарокі ўратавалі», – з гонарам дадаў другі. Усё насельніцтва гаспадаркі захвалявалася, загуло, абмяркоўваючы, дзе і калі магла згубіцца гэткая каштоўная рэч.

Певень падхапіўся, асцярожна ўзяў тое, што так доўга шукаў...

Яго ўласны гадзіннічак! Маленькі, зграбненькі, з дзвюма бліскучымі палачкамі і шыкоўнай шапачкай зверху! З замілаваннем выцер бялюткі кружочак, шапачку і прыціснуў да сябе: «Ідзе! Час ідзе!» Усе гэтак жа шпарка бегалі палачкі...

«Час не знік! Вось ён у мяне!» – з гонарам абвясціў Певень, узняўшы вышэй гадзіннік, каб было бачна ўсім.

«А ён і не губляўся...» – пачулася недзе збоку. Певень азірнуўся і ўбачыў Казла. Той стаяў, паказеліўшы на ўсіх вочы, павольна плямкаючы зяляніну. «Час згубіць нельга. Тое, што ў цябе блішчыць, – прыгожая цацка. Яна пра час толькі нагадвае. Як ты... – працягваў Казёл, – Час не спыняецца... Ён заўсёды ідзе...» Сказаў і патупаў па сваіх справах. Пеўню стала няёмка...

Сапраўды, час ішоў, не звяртаючы ўвагі на тое, дзе быў яго гадзіннічак. «Вунь і Сонейка на Небе ўжо як высока... а ён, Певень, гэтак ганарыўся сваёй адметнасцю...»

Кураняткі расказвалі ўсім, дзе яны знайшлі і як змагаліся з Сарокай. Насельніцтва гаспадаркі гаманіла, выказваючы сваё хваляванне за згубленае і знойдзенае... Певень падышоў да плота і ўладкаваў на ім гадзіннік. Адышоў крыху, азірнуўся: «Зручна!»

Заўважыў Сароку, якая сядзела на галінцы побач і пільна сачыла за ўсім, што адбываецца на падворку. «Не крадзі. Добра? Няхай для ўсіх будзе...» Пайшоў, потым спыніўся і азірнуўся зноў: «Прыгожа!»

Гадзіннічак зіхацеў...

Здаецца, само Сонейка разам з бліскучымі палачкамі шпарка рухалася па бялюткаму кружочку, нагадваючы ўсім пра тое, як хутка ідзе час і якія каштоўныя яго імгненні.

А Певень? Спявае... Як і раней. Калі? Калі трэба. Ён ведае. Як і раней, яго паважаюць за дакладнасць. А яшчэ за шчырасць. Выцягвае ўперад шыю, заплюшчвае вочы і спявае: «Ку-ка-рэ-ку!» Непараўнальна...





# Камень

Камень ляжаў і грэў спіну…

Колькі помніў сябе – так і ляжаў. Шмат разоў хацелі яго забраць: хто на падмурак, хто на іншыя патрэбы, але нічога не атрымлівалася. Так і застаўся…

Камень быў адметны: вялікі, белы, з гладкімі, кранутымі зяленым імхом бакамі.

Побач з Каменем ішла дарога. Яна амаль зусім зарасла, толькі дзе-нідзе былі ледзь бачны яе каляіны.

Камень паглядаў на дарогу кожны дзень, і яна час ад часу, нагадвала яму пра тое, што засталося ў яго шчылінках назаўсёды…

Спіна ў Каменя нарэшце нагрэлася… Ён ляжаў і з асалодай убіраў у сябе пасля халоднай начы яшчэ цёплыя промні восеньскага Сонца. Уласны цяжар не замінаў яму, здаецца, за апошнія гады ён нават крыху падняўся да Сонца вышэй.

Камень любіў Восень. Яна заўседы прыносіла з сабою яркія колеры, ад якіх станавілася хараша. Восень таксама прыносіла з сабою ўспаміны…

У той час дарозе зарастаць травою не было часу: па ёй бясконца спяшаліся людзі на конях або пехатою, цягнучы з сабою патрэбныя ім рэчы.

«Куды яны ўсе бягуць, навошта цягнуць тое, што данесці не заўсёды здольныя?» – думаў Камень, усміхаючыся ў той час, калі нехта зноў спрабаваў сцягнуць яго з месца, на якім ён, колькі сябе памятае, так і ляжаў заўсёды.

Увогуле, каля яго часта спыняліся, бо гэта было вельмі зручна. Лепшага суразмоўцу, чым Камень знайсці было цяжка, ён не мог размаўляць – затое слухаў. І не толькі людзей, а і таго, хто быў з імі побач… Да таго ж, ляжаў Камень на высокім пагорку, з якога было добра бачна ўсе наваколле.

Пахмурнай раніцай, калі вецер яшчэ не расцягнуў шэрыя пасмы густога туману, на дарозе паказаліся двое: старая Кабыла і гэткі ж стары дзед, які, салодка пасапваючы, даглядаў на вазе свой сон.

Кабыле было цяжка...

Няроўна дыхаючы, яна цягнула на сябе незлічоную колькасць мяхоў, вялікіх і малых торбачак і яшчэ нешта загорнутае ў грубы кавалак тканіны.

Каля Каменя Кабыла спынілася ад нямогласці, а потым, не пачуўшы звычайнага крыку: «Но-о, п-ш-шла!», асцярожна звярнула ў бок і пачала паціху есці траву, якая, нягледзячы на позні восеньскі час, тут на горцы, была заўсёды сакавітая.

Смачна пахрумстваючы сцяблінамі, яна як мага цішэй старалася грукаць цуглямі, але тыя здзекліва бразгалі, нагадваючы ёй, аб тым, хто яе запрог і каго яна вязе...

Вязе... Колькі ўжо гадоў вязе. Не ведаючы нават куды, вязе. Куды пакажуць. Не пытаючыся, ці стамілася яна, ці добра ела. «Кабыла? Вязі і ўсё тут!»

Яна везла...

Спачатку, яшчэ ў маладосці, спрабавала брыкацца, потым сцішылася: іншыя ж таксама вязуць, чым я лепшая за іх?

Яна не была супраць цяжару, супраць таго, каб браць на сябе тое, што яны не здольныя несці самі, але каб ведаць куды...

«Калі б хоць крыху меней... Навошта столькі?» – у яе вялікія прыгожыя вочы, як у люстэрка, паглядалі думкі. Кабыла пацёрлася мордай аб Камень і пачала сваю размову...

Лепшай дапамогай бывае... маўчанне.

Камень гэта ведаў і таму, нават калі б быў здольны размаўляць, усё адно маўчаў бы. Маўчанне захоўвае цішыню, толькі ў цішыні пачуеш самога сябе...

Можа тады лепшае знойдзеш сам?

Кабыла разважала пра сваё жыццё. Не шукаючы спачування, вяла гаворку з сабою пра сябе ж...

Камень слухаў і здзіўляўся: колькі разоў ён бачыў слёзы, чуў крыўды, абразы. Зараз такога не было!

Кабыла не стагнала, не пасылала праклён свайму лёсу, яна размаўляла з сабою пра тое, што стамілася ісці не сваім шляхам.

Яна паглядала на тое, як Восень рассцілае сваю стракатую хустку на Зямлі і, толькі зрэдку ўздыхаючы, казала пра тое, як хацела б прачынацца там, куды заве яе сэрца – вялікае, чулае, добрае.

Яна не баіцца працы, зразумела яна – кабыла. Але навошта крык і бізун? Кабыла не прасіла дапамогі... Яна змоўкла і зноў пачала асцярожна хрумстаць травой, зрэдку паглядаючы на таго, хто ўсе так жа салодка пасопваў сярод мяхоў.

Камень маўчаў...

Хіба ён мог ёй дапамагчы? Ён, Камень, які заўсёды быў задаволены сваім становішчам, ганарыўся сваёй нерухомасцю, зараз балюча адчуваў сваю нямогласць. Вялікі, разумны, але... нямоглы! Няпраўда, што камяні не плачуць.

Кола ваза зачапілася за бок Каменя раз... другі...

Невядома колькі сілы захоўваюць у сабе, на першы погляд, нежывыя істоты, колькі радасці або суму часам здольныя перадаць яны!

Камень стараўся... I як!

Кола зачапілася за яго бок яшчэ раз і, быццам цацачнае, разляцелася на маленькія кавалачкі! Разам з цяжарам знікла адчуванне безвыходнасці лёсу...

Воз, які прыгнятаў столькі гадоў, разваліўся! Абарваліся шматлікія пастромкі і стала свабодна!

Кабыла пераступіла праз аглоблі, хамут споўз з яе, цуглі выслізнулі і, жалобна бразнуўшы аб Камень, зваліліся ў траву. Яна не чула крыкаў, якія ляцелі наўздагон.

Яна ішла па Зямлі і адчувала яе... Ішла туды, куды заве сэрца вялікае, чулае, добрае. У вачах знік сум, у іх з'явілася Прыгажосць. У такія вочы можна глядзець бясконца...

А Камень?

Камень бачыў шчасце іншага і радаваўся. Ён таксама быў шчаслівы. Хіба штосьці можа гэтаму замінаць?

Колькі разоў з таго часу прыходзіла Восень, Камень не лічыў. Ён заўседы пазнаў бы тую Кабылу... па яе вачах.

На гэтай дарозе яе больш не было... Яна ішла недзе па Сваёй...

Камень ляжаў і грэўся на Сонцы, падстаўляючы апошнім цёплым промням спіну, на якой засталіся глыбокімі шчылінкамі ўспаміны: Кабыла, Прыгажосць, Дарога...





# Апошні Лісцік і Вецер

Халодны восеньскі Вецер доўга зрываў лісцё ў вялікім парку, стаміўся, хацеў было ляцець далей, але вырашыў адпачыць.

Сцішыўся і толькі ўладкаваўся на вяршаліне дрэва, як пачуў пявучы танюткі галасок. Быццам крынічны струменьчык ліліся ў паветра празрыстыя высокія гукі. Вецер азірнуўся і ўбачыў побач з сабой апошні Лісцік.

Сярод шэрых аблокаў, ледзь трымаючыся за галінку дрэва, той ціхенька гойдаўся і, паглядаючы на Вецер, спяваў!

– Ты што, мяне не бачыш? – спытаў Вецер і сабраўся было, што моцы дзмухнуць на Лісцік, як пачуў сціплае:

– Бачу! Не зрывай... Пачакай яшчэ крышачку, добра?

– Добра! – згадзіўся Вецер і пацікавіўся: – Ты для каго спяваеш? Хто цябе тут пачуе?

Лісцік скончыў сваю песеньку і адказаў:

– Я спяваю для цябе!

– Для мяне? – здзівіўся Вецер, – я ж халодны, жорсткі...

– Для цябе! Вось паслухай! – адказаў Лісток і зноў запеў.

Не звяртаючы ўвагі на халодныя кроплі дажджу, на яго, Ветра, халоднае дыханне, маленькі Лісцік так шчыра ствараў сваю высокую мелодыю, што, здавалася, з кожным гукам паветра вакол яго становіцца цяплейшым.

– Ты ўвесь час, вось так, спяваеш адзін? – разгубіўся Вецер.

– Не, не адзін, – усміхнуўся Лісцік. – Іншыя таксама спявалі.

Вецер доўга маўчаў, а потым спытаў:

– Калі?

– Заўсёды, калі ты быў з імі побач.

Ветру стала сорамна, ён ніколі не прыслухоўваўся да іншых, калі хацелася, дзьмуў што моцы, і ўсё. Вецер зноў змоўк, а потым казаў ледзь чутна:

– Калі хочашь, я цябе кранаць не буду. Добра?

– Добра! – узрадаваўся Лісцік і ад радасці загойдаўся так моцна, што ледзь не сарваўся з галіны.

– Цішэй ты! – супакоіл яго Вецер, падтрымаў за ускраек і спытаў:

– Ты ведаеш, што прыдзе Зіма?

– Ведаю...

Апошні Лісцік варухнуўся і ўздыхнуў:

– Мне б толькі крышачку пабыць тут наверсе, бліжэй да Неба.

– Навошта? Яно ж стала халодным. Нават Сонца ужо не сагрэе  цябе сваім цяплом.

– Няхай не сагрэе. Што з таго? Затое я ведаю, як тут было хораша Вясной і Летам.

– А што будзе далей? Ты ведаеш?

– Далей будзе сцюжа і снег.

– Далей прыйдзе зімовы Вецер, яшчэ больш безлітасны чым я. Там унізе, сярод сваіх табе было б цёпла. А тут ты будзеш адзін. Няўжо табе гэта патрэбна?

– Патрэбна... – ціха адказаў Лісцік і зноў замаўчаў.

Вецер узняўся было ў Неба, а потым павярнуў назад.

– Хочаш я вазьму цябе з сабой? – спытаў ён. – Хочаш?

– Хачу! – радасна загоўдаўся Лісцік.

Халодны восеньскі Вецер беражна падхапіў Лісцік і панёс па Небу. Быццам дзіцятка ў калысцы, ласкава люляў яго на сваіх паветраных хвалях і слухаў танюткі галасок. Пяшчотна прыціскаў маленькі цуд да сябе і адчуваў, што ён, Вецер, становіцца іншым...

Яго дыханне ўжо не было такім халодным. Знікла жорсткасць з якой раней Вецер зрываў апошняе лісцё з дрэў. У ім з’явілася цяплыня і ласкавасць, няхай крыху сумныя, ўсёж-такі ён – восеньскі.

У вышыні, сярод шэрых аблокаў, то вышэй, то ніжэй узнімаўся маленькі апошні Лісцік, танюткай развітальнай паштоўкай, нагадвая ўсім, што ёсць на Зямлі тое, што можа сагрэць нават халодны восеньскі Вецер...





# Блазан

Жыў на Свеце Блазан, які ніколі не бачыў, як растуць Суніцы...

«Якія яны?» – неаднойчы пытаўся ён у Караля, але таму гэтае пытанне было нецікавае і, увогуле, Кароль лічыў, што ўсё, што ён есць, вырасла... на талерках. Раніцай – на залачонай талерцы з блакітнай палоскай, якую яму заўсёды прыносілі амаль у ложак. У абед усё расло на вялікіх і малых талерках, што ў незлічонай колькасці стаялі на дубовым стале ў Белай зале. Увечары – на талерках з срэбра.

Таму пытанне Блазна спачатку ўспрымалася як чарговы жарт, але з цягам часу яно надакучыла, і калі сёння Кароль пачуў яго зноў, ён скрывіўся, быццам яму ў рот трапіла нешта вельмі кіслае, і прамовіў: «Калі ўжо табе гэта так цікава, знайдзі адказ сам».

Блазан разгубіўся: ён ніколі, з самага дзяцінства, не выходзіў за вароты палаца, усё, што яму трэба, таксама прыносілі на талерцы, толькі, вядома, значна меншых памераў. Ён павінен быў есці смешна, запіхваючы ежу ў рот абедзвюма рукамі, нават калі есці зусім не хацелася.

На самой справе смешна было толькі Каралю і яго світе, у Блазна ж у такі час да горла падступалі слёзы. Слёзы нікому з гледачоў былі непатрэбныя – ім хапала сваіх, таму, калі яны раз-пораз капалі ў талерку Блазна, іх ніхто не заўважаў.

Адкуль узялося гэтае пытанне, Блазан зразумець не мог, проста ўжо колькі начэй запар ён бачыў Суніцы ў сваім сне. Яны, быццам чырвоныя пацеркі, зіхацелі сярод зялёных карункаў лісця, вабячы сваёй прыгажосцю. Сонца лашчыла, песціла іх, азіраючы з розных бакоў. А водар! Ні з чым не параўнальны, ён адчуваўся нават у сне.

Чаму з’явіўся такі сон, Блазан растлумачыць не мог... Хіба памяць бабулі перадала яму гэта?

Бо сам ён, колькі помніў сябе, усё сваё жыццё правёў у палацы. У палац яго аддала маці... Знясіленая цяжкай працай і паўсядзённымі турботамі, яна не ведала, што рабіць з кволым дзіцяткам, на якога, да таго ж, забылася глянуць прыгажосць, пашкадаваўшы яму сваіх скарбаў.

У палацы маленькі Блазан паступова прызвычаіўся да насмешак, навучыўшыся хавацца ад іх за ўласнымі жартамі. Дарэчы, розумам яго Жыццё не пакрыўдзіла, і таму, калі ён выпадкова трапіў на вочы Каралю, той яго заўважыў. Каралю Блазан падабаўся. Да таго ж маленькі, крывы, з вялікім кірпатым носам, ён выгадна падкрэсліваў залачоную прыгажосць Караля і яго палаца.

Але ізноў жа пра сон... Незвычайны, быццам нейкі знак, ён абуджаў у сэрцы таямнічае пачуцце, якое вабіла невядома куды, але Блазан адчуваў, што яму абавязкова трэба ведаць, як растуць суніцы. Таму, разгубіўшыся спачатку, ад нечаканай прапановы Караля, ён рашуча сабраў свае рэчы і, закінуўшы маленькі вандзэлак на плячо, пайшоў шукаць тое, што так моцна звало яго апошнім часам. Ён ішоў туды, дзе растуць суніцы...

Сонца з вышыні Неба з цікавасцю пaглядала, як крочыць па пыльнай дарозе маленькі згорблены чалавек. Птушкі, стаміўшыся ад дзённай спякоты, адпачывалі, чуўся толькі гул пчол ды чмялёў на лузе, што цягнуўся па абодвух баках . Неўзабаве дарога апынулася ў зялёнай прахалодзе лесу. Так прыгожа свяціла Сонца праз лісце, што Блазан спыніўся ў захапленні...

Такога ён ніколі не бачыў! Шэры камень, пазалота, дзіўныя расліны ў пакоях палаца – і ўсе. А тут... зусім іншае... Тонкія, на першы погляд непрыкметныя пялёсткі лясных кветак. Зялёны колер, яго любімы колер, з незлічонай колькасцю адценняў, якія, напэўна, і мастаку ўявіць складана. Ствалы дрэў, светлыя і пацямнелыя, гладкія і шурпатыя, быццам твары людзей: маладых і старых, дзе кожная маршчына – сцяжынка Жыцця. Цішыня, ледзь чутны шэпт ветрыка аб нечым...

Ногі, абутыя дзеля смеху ў занадта вузкія і доўгія, з вялікімі цяжкімі спражкамі туфлі, балелі. Блазан прысеў і, дастаўшы іх са злосных абцугоў, з вялікай асалодай выцягнуў на мяккай коўдры травы.

Ён заплюшчыў вочы, падстаўляючы твар цяплу сонечных промняў... Невядома, колькі прайшло часу. Ды хіба гэта мела значэнне? Як дыханне, павольна да яго прыйшло адчуванне адзінства з усім, што існавала навокал. Здаецца, само сэрца стала біцца інакш – не так, як раней. Паступова яно напаўнялася спакоем, радасцю. Яго моцныя і роўныя штуршкі разносілі па кволаму цельцу нейкае невядомае яму дагэтуль адчуванне ўласнай сілы...

Блазан прыслухоўваўся да сябе, здзіўляючыся неспадзяваным пераменам, кранаў па-дзіцячы маленькімі пальчыкамі, чырвонымі ад нязвыклай  вандроўкі, сцяблінкі траў і ўсміхаўся...

Гэтак прыгожа усміхаюцца маленькія дзеці, чаруючы дарослых сваёй радасцю Жыцця. Проста таму, што яно, Жыццё, існуе.

Блазан заснуў. Непрыкметна Сонца хавалася за край Неба, нанізваючы яшчэ адзін дзень на сваю нітку. Дзьмухнуў ветрык і прынёс водар вечаровых кветак, які абудзіў начных матылькоў. Лес набываў таямнічыя адценні, ствалы дрэў зусім пацямнелі, іх лісце хавала сонечныя промні, дзе-нідзе дазваляючы ім прабіцца ўніз танюткай развітальнай паштоўкай. Надыходзіла ноч...

Рэзкі крык абудзіў Блазна. Ён адкрыў вочы і ўбачыў над сабой даволі вялікую птушку. Яна пераляцела на іншае дрэва і зноў пранізліва крыкнула, усім сваім выглядам паказваючы, што ў гэтым месцы гаспадыня – яна. Блазан агледзеўся. Пасля каралеўскага палаца прачынацца вось гэтак было нязвыкла.

Шмат гадоў ён кожную раніцу бачыў знаёмую да дробязей камору, абабітую рознакаляровымі кавалкамі тканіны. Ён зусім не жадаў каб яго жыллё было такім, але хто калі яго пра гэта спытаў? Трэба быць смешным – і ўсё, нават каб быў смешным твой дом, які час ад часу можна было паказваць іншым дзеля забавы. Спачатку было цяжка, а потым Блазан перастаў звяртаць на гэта ўвагу.

Затое ў яго каморы мелася акенца, з якога было бачна Неба... Часам пранізліва-ўзнёслае – вялікі блакітны акіян, дзе зрэдку праплываюць паветраныя караблі аблокаў, часам шэрае, цяжкое, з пахмурным дробным дождджыкам.

Асабліва прыгожым Неба было ўвечары, калі Сонца знікала за цёмнай палоскай лесу, на развітанне пакінуўшы размаляванае апошнімі промнямі палатно. Што можа параўнацца з гэтым?

Калі на Небе з'яўляліся зоркі, Блазан любіў размаўляць з імі...

Ён быў сапраўдным філосафам: у падзеях, якія адбываліся навокал, заўважаў тое, чаго не бачылі іншыя. Нічога, што зоркі маўчалі, затое яны ўмелі слухаць, і, напэўна, ім, адзіным у палацы не былі патрэбныя яго жарты. Такія, каб той, хто смяяўся, адчуваў сябе вышэйшым за іншых. Зоркам гэта не патрэбна – яны і так высока.

У лесе стала цёмна. Лёгкае адзенне не захоўвала цяпла. Блазан хацеў дастаць з торбачкі кавалак хлеба, але тая птушка, што абудзіла яго, ізноў рэзка крыкнула і нахабна ўселася перад ім. «Ды не хвалюйся ты, я зараз пайду, – суцешыў яе Блазан, узяў было ў рукі свае туфлі, потым паглядзеў на іх і паставіў на вялікі камень. – Можа, табе на што-небудзь спатрэбяцца...» Усміхнуўся птушцы і пайшоў па ледзь бачнай у цемры дарозе далей.

Босыя ногі, здаецца, адчувалі кожны каменьчык, галінку на дарозе. Час ад часу, Блазан спатыкаўся падаў. Гэта зусім яго не злавала, крокі яго сталі пругкія, лёгкія, быццам ён хадзіў вось так заўсёды. Ён не ведаў, куды прывядзе гэтая дарога і што чакае там, наперадзі. Але Блазан ішоў і чамусьці зусім не хваляваўся.

Стала яшчэ цямней. Дрэвы стаялі блізка адзін да аднаго, лісце іх так шчыльна закрывала Неба, што, здавалася, гэта не лес, а таямнічы вялікі пакой, ў якім не бачна вокнаў, дзвярэй, сцен... Разумееш: яны існуюць, а між тым, да іх дакрануцца нельга. Але Блазан не адчуваў цяжару цемры – ён проста ішоў, таму што яму так трэба. Колькі прайшло часу? Хто яго ведае. Стомленасці ў целе амаль і не было, толькі каменьчыкі паступова пачалі здавацца больш вострымі.

Наперадзе нешта бліснула, адзін раз, другі... і неўзабаве дарога прывяла Блазна на невялікую паляну. Дрэвы расступіліся, дазволіўшы Небу зазірнуць на Зямлю. Амаль чорнае, бязмежнае, яно зіхацела незлічонай колькасцю зорак.

Пасярод паляны гарэў касцёр, каля якога сядзеў Стары. Блазан павітаўся і сеў побач, нават не запытаўшыся дазволу. Гэта не здалося яму дрэнным – было вельмі добра разам са Старым глядзець на агонь.

Стары быў светлы. Менавіта светлы, таму што ўсё ў ім было светлае: палатнянае адзенне, доўгія сівыя валасы, барада, вусы... Але галоўнае – светлым быў яго твар. Стары не здзівіўся начному госцю. Вялікімі зялёнымі вачыма ён уважліва паглядзеў на Блазна і спытаў:

– Стаміўся ісці?

– Не, – адказаў Блазан і толькі тут адчуў, як балюча пякуць ногі. Ён паглядзеў на свае зраненыя да крыві падэшвы і засмяяўся:

– Каменьчыкі вось толькі...

– Па вострых камянях босымі нагамі лягчэй ісці ўсміхаючыся... – задумліва прамовіў Стары, сарваў побач з сабой раслінку, расцёр яе у далоні і працягнуў Блазну: – Прыкладзі, будзе лягчэй.

Потым паказаў гэткую ж:

– Запомні яе, яна дапаможа табе ў дарозе.

– Ты тут жывеш? – запытаўся Блазан, адчуваючы прыемную цеплыню ў нагах, якая забрала боль і стомленасць.

– І тут таксама...

– Даўно?

– Столькі, колькі трэба.

– З табой побач вельмі хораша, дзякуй табе.

– Гэта табе хораша з самім сабой...

Стары ласкава паглядзеў на Блазна і усміхнуўся:

– Ты рады, што ты ідзеш сваёй Дарогай...

– Я не ведаю, куды яна прывядзе. Я раней па ёй не хадзіў.

– Слухай свае сэрца, яно ніколі цябе не падмане...

– Ды я яго слухаю.Таму вось іду... Ведаеш, я хачу ўбачыць як растуць суніцы. Ніколі не бачыў: у палацы іх да стола не падавалі. Мне так патрэбна ведаць! Якія яны? Я бачыў сон, колькі разоў бачыў... адзін і той жа, нават водар іх памятаю... Але, дзе яны растуць? Можа, ты ведаеш?

– Ты знойдзеш іх сам. Гэта твая Дарога...

– Ты таксама ідзеш па сваёй?

– Вядома.

– І шукаешь адказы на свае Пытанні?

– Так.

– А калі Пытанні скончацца?

– Яны ёсць, пакуль я іду.

– І табе не надакучыла вось так усё жыццё ісці і шукаць адказы? Ты ж зусім сівы!

– Дарога і ёсць жыццё. Хіба яно можа надакучыць? Кожны з нас бачыць тое, што можа бачыць, бярэ з сабой тое, што здольны несці, сустракае таго, хто яму патрэбны. Горача, холадна, лёгка, цяжка – залежыць ад нас. Якія мы – такая і наша Дарога...

– Ты заўседы гэта ведаў?

– Не, раней я сваю Дарогу не заўважаў...

– Напэўна, я таксама...

– Таму табе прысніўся сон...

– У цябе ён быў?

– Не, мяне паклікала ў Дарогу іншае.

– Табе не сумна вось так усе жыццё ісці аднаму?

– Я не адзін. Хіба ты адзін?

– Мне так лепей...

– Проста, ты яшчэ не знайшоў тое, што табе трэба...

– А ты?

– Згубіў незнарок, цяпер шукаю зноў...

– Вяртаешся?! Вох! Я ж пакінуў на камені свае шы-ыкоўныя туфлі, а калі раптам яны ізноў мне спатрэбяцца, а?! – ускрыкнуў Блазан і па старой звычцы зморшчыў твар, каб быць больш смешным.

– Калі яны табе спатрэбяцца, атрымаеш новыя, гэткія ж... Па Дарозе, якой ідзе кожны, вяртацца назад нельга... Ты ж не можаш вярнуць тое, што было раней?

– Не.

Блазну стала сорамна і ён, апусціўшы вочы, ціха прамовіў:

– Прабач, калі ласка, я не хацеў цябе пакрыўдзіць...

– Ты мяне не пакрыўдзіў, мы часцей крыўдзім саміх сябе... Ты добры і чулы. У гэтым твая Сіла. Толькі памятай пра гэта – і ўсё будзе добра.

– Добрым і чулым на Свеце цяжка, я гэта ўжо паспытаў на сабе даволі... – сумна прамовіў Блазан.

– Цяжка, калі ты гэта хаваеш, саромеешся таго, што табе падаравана. Табе зрабіла Жыццё падарунак: з'явіўся ты – такі, якога на Свеце больш няма.

– Няма... Ужо такога, як я, вядома... Нават роднай маці калісьці стаў непатрэбны!

Нечакана для самога сябе, Блазан сказаў тое, што столькі гадоў мучыла яго, не давала спакою. Цяпер яно вырвалася... Буйныя слёзы гарошынамі каціліся па яго твары, змываючы шматлікія крыўды, якія ён столькі гадоў хаваў за смехам.

Стары маўчаў і, толькі, калі Блазан сцішыўся, выціраючы торбай свой кірпаты нос, ціха сказаў:

– Не бяры з сабой у Дарогу крыўду. Навошта яна табе? З крыўдаю ісці цяжка. Адпусці яе... Хутка прыйдзе новы Дзень і падорыць табе сваю Радасць.

– Таму ты такі светлы?

– Магчыма...

Стары паварушыў сваім невялічкім кійком касцёр. Начны ветрык дзьмухнуў на агонь і панёс у Неба, якое ўжо пачынала святлець, россып знічак. Яны ўзняліся ўверх і забралі з сабою ўсё тое, што так доўга сціскала сэрца Блазна.

Дыхаць стала свабодна... Так бывае пасля дажджу. Блазан лёгка ўздыхнуў і, скруціўшыся абаранкам каля вогнішча, заснуў.

Ён спаў так прыгожа! Падсунуўшы далоні пад шчаку, падціснуўшы калені, салодка ўсміхаўся ў сне, зрэдку прычмокваючы вуснамі.

Яго маленькі твар ужо не здаваўся гэткім зморшчаным, як раней, нават нос не выглядаў вялікім. Блазан спаў і зноў бачыў свой сон...

Ноч саступіла месца новаму дню. Ён прынес з сабой раніцу, якая абудзіла святлом лес. Адна, другая, яшчэ адна... на Блазна капалі кроплі расы, што міжволі зрываліся з галінак над ім. Блазан прачнуўся...

Праз тонкую хусцінку туману на паляну праглядвалі першыя промні Сонца. Чаруючы сваёй вытанчанасцю, яны кружыліся ў толькі ім адным вядомым танцы. Касцер патух, але вуголле яшчэ злёгку дымілася, нагадваючы пра мінулую ноч. Старога не было.

Блазан працёр вочы і сеў. «А ці быў ён, увогуле? Можа гэта чарговы сон і трэба вяртацца? Вяртацца... Куды? Адкуль прыйшоў?»

Блазан задумліва перавёў позірк з шэрага вогнішча на траву... і раптам яго сэрца ахапіла незвычайная, ніколі неадчуваная дагэтуль так моцна, радасць! Ён убачыў як растуць суніцы... Невядома чаму, але ён дакладна ведаў, што гэта – яны!

Сярод трайнога, з разнымі краямі, лісця блішчэлі на Сонцы ягады! Невялікія, крыху падоўжаныя, яны віселі на танюткіх сцяблінках, злёгку шурпатыя ад насення. Ярка-чырвоны колер, колер Жыцця, надаваў ім непаўторную прыгажосць, адметна выдзяляючы на зялёным фоне. Яго сунічная паляна! Блазан асцярожна, ледзь кранаючы пальцамі, сарваў адну ягаду, другую...

Ніводныя заморскія прысмакі ніколі не здольны параўнацца з тым, што расце ў мясцінах, дзе ты нарадзіўся і вырас. Усё, што побач, жыве разам з табою, першапачаткова існуе ў памяці, прыходзячы незразумелым да пэўнага часу пякучым жаданнем патрымаць у сваіх далонях тое, што калісьці надавала сілы тваім продкам.

Водар, смак, так яскрава вызначаныя ў снах, прыйшлі, запоўніўшы ўвесь Свет! Здаецца, няма мяжы шчасцю. Яно напаўняла сабой кволенькае цела Блазна. Ды, нарэшце, хіба яго памеры больш значныя за памеры сэрца?

Блазан... смяяўся! Які гэта быў смех! Чысты-чысты, звонкі-звонкі... Так смяюцца дзеці, якія ўсё жыццё побач... Лес падхапіў гэты цуд і панёс яго

празрыстым рэхам, як найкаштоўнейшае багацце, каб падзяліцца радасцю з кожнай жывой істотай...

Блазан смяяўся, і разам з тым пачынаў разумець, што Блазна больш няма – ёсць той, хто ім быў калісьці... Ён падняўся, беражна і пяшчотна трымаючы ў сваіх далонях маленькія чырвоныя ягады...

Ён пакуль не ведаў, як яго трэба называць, але ведаў, што на Свеце ёсць Жанчына, якая даўным-даўно, разам са святлом Жыцця, падаравала яму яго Імя.

Ён абавязкова пойдзе туды і там таксама будуць рады суніцам... Яго суніцам... І яшчэ ён ведаў, што тая Дарога па якой ён ідзе – гэта яго і толькі яго Дарога, дзе выбар заўсёды робіш сам... Доўгая, кароткая – хто ведае? Ён збіраўся ўжо было ісці, ды ўбачыў каля вогнішча кіёк Старога. Усміхнуўся: «Добры, светлы чалавек... не сон гэта быў! Дзякуй табе...» І прыгадаў яго словы: «Сустракаем таго, хто патрэбны...»

Ён паклаў побач  свой вандзэлак... Ўзяў толькі хлеб... Навошта яму астатняе? Пайшоў па дарозе...

Сонца з вышыні Неба паглядала, як лёгкімі крокамі ішоў далей Чалавек...





# Нарадзілася ў Небе Зорка

Нарадзілася ў Небе Зорка...

Адкрыла вочкі... Цёмна вакол, халаднавата. Убачыла побач Старэйшую Зорку, запыталася: «Хто я?» Старэйшая ўсміхнулася і пасунулася бліжэй:

– Зорка ты.

– А ты?

– І я таксама...

– А чаму тут так цёмна?

– Каб не мы, было б яшчэ цямней...

– Ты такая прыгожая! Я не такая!

– Проста ты яшчэ не вырасла.

– А гэта абавязкова?

– Калі хочаш свяціць ярка, трэба расці.

Маленькая Зорка азірнулася, убачыла на Небе шмат іншых зорак, вялікіх і не вельмі:

– А што трэба, каб вырасці?

– Думаць пра таго, каму ад цябе святлей... Там, унізе на Зямлі, жывуць людзі і ў кожнага – свая зорка. Пакуль ёсць жыццё там, жывем і мы.

– Разам са мной нарадзіўся нехта і там?

– Вядома. Разам з табой на Зямлі нарадзіўся маленькі Чалавек.

– А як я яго пазнаю?

– Ён будзе шукаць цябе на Небе...

– Калі?

– Калі падрасце.

– Колькі часу на гэта трэба?

– Кожны расце па-свойму...

– А ён мяне заўважыць?

– Калі твой свет будзе для яго яркім...

– Як гэта?

– Калі думаеш пра іншага радасна і жадаеш яму дабра, тваё святло стане мацнейшым. Той, каму яно патрэбна, гэта рана ці позна зразумее і знойдзе цябе.

– Нават на гэткім цёмным Небе?

– Так.

– Яно заўсёды такое?

– Не. Бывае яшчэ дзень.

– Дзень?

– Дзень. Калі свеціць вялікая зорка Сонца – адна на ўсіх, хто жыве на Зямлі. Ад яе цёпла. Днём яно саграваe ўсіх, а ноччу адпачывае.

– Дык навошта патрэбны мы, зоркі?

– Каб свяціць тады, калі больш свяціць няма каму...

– А там на Зямлі хіба не адпачываюць?

– Адпачываюць, вядома... А калі раптам, хто прачнецца? Кожнаму трэба ведаць, што на Небе заўседы ёсць яго Зорка...

Зорка азірнулася:

– Чаму вунь тая ледзь свеціць?

– Яна стамілася чакаць, пакуль яе заўважыць той, дзеля каго яна з'явілася...

– А калі яна не спатрэбіцца яму ўвогуле?

– Згаснуць пастунова: адзін там, на Зямлі, другі тут, на Небе...

– Ён не зразумеў, што ў яго ёсць свая Зорка?

– Напэўна, так. Шкада...

– А колькі свяціць мне? Ты ведаеш?

– Не. У кожнай зоркі свой час...

На цёмна-сінім Небе, у якім ніколі не адзначыць мяжу, глыбіню – ды і навошта іх вымяраць? – размаўлялі паміж сабою дзве зоркі: старэйшая і малодшая.

Адна пражыла на Свеце ўжо шмат і адчувала, што хутка згасне, другая

толькі нарадзілася. Адна навучылася свяціць вельмі ярка і, напэўна, той, каму яна свяціла, жыў там, далека на Зямлі, гэтак жа. А другая, маленькая, пакуль яшчэ дакладна не разумеючы, дзеля чаго яна з'явілася ў гэтым цёмным халодным Небе, вельмі хвалявалася за таго, хто таксама пачынаў свае жыццё там.

Там, унізе, на Зямлі, глядзеў на Неба вялікімі вачыма Чалавек, які толькі нарадзіўся...

Бацькі здзіўляліся: «Што за дзіця! Цуд! Засынае толькі гледзячы на зоркі!» А Зорка і Чалавек шукалі, шчымліва адчуваючы, што гэта ім патрэбна...

Яны абавязкова знойдуць адзін аднаго! Тады абодвум расці стане лягчэй, а святло іх жыцця там, на Зямлі, і тут, на Небе, будзе яркім...

Нарадзілася Зорка у Небе ясна.
Дзень прайшоў і нарадзіўся новы.
Не забыць, шукаючы нам шчасця,
Неба і Зямлю ўзяць у аснову...





# Свечка

Свечка гарэла...

Не ведала, наколькі яе хопіць. Не паглядала па баках, не прыслухоўвалася. Ярка, ці не? Не ведала. Свяціла так, як атрымлівалася.

Свечка гарэла...

Старанна трымала спіну, выцягваючы ўверх рукі – проста стаяла і свяціла.

Калі бачыш цемру, ведаеш – ёсць Святло. Калі адчуваеш Цяпло, разумееш – дзесьці ёсць холад. Калі ёсць Любоў – Святло існуе...

Свечка гарэла...

Адна за адной гарачыя кроплі капалі на падлогу. Яна усміхалася ім, разглядаючы малюнак, які паступова складаўся з яе самой.

Свечка гарэла... Ад яе мяккага пяшчотнага цяпла сэрца б’ецца роўнымі і моцнымі штуршкамі. Дзіўна...

Свечка гарэла!





# Папараць-Кветка

Шукаў Чалавек Папараць-Кветку...

Доўга шукаў. Колькі не пытаўся – ніхто не бачыў яе ніколі.

«Вось знайду гэтую Кветку і адразу стану шчаслівым! – думаў Чалавек. – Як знайду, то пасаджу ў сябе ў садочку. Буду даглядаць, як самога сябе. Ды не дзіва – гэта ж шчасце!»

У Чалавека таго ў хаце багацця было незлічонае, але, напэўна, чагосьці ўсе ж такі не ставала: таму і пайшоў шукаць.

«Якая яна гэтая Папараць-Кветка? Вялікая ці малая?» – думаў Чалавек, блукаючы па лесе. Уяўляў яе то вялікай чырвонай, быццам агонь, то маленькай блакітнай, з дробнымі яскравымі пялёсткамі. «Вось яшчэ трошкі – і знайду, абавязкова знайду», – з надзеяй казаў сам сабе.

Доўга блукаў. Чым далей ішоў – тым больш жадання знайсці. Спыніўся. «Вось адпачну крыху і пайду далей», – падумаў.

Сеў, азірнуўся, удыхнуў паветра і здзівіўся: лёгка неяк стала на сэрцы. «А можаісці далей не трэба? Колькі шукаю – нават знаку няма. Каб ведаў, хаця б дзе! Кажуць, у самым гушчары, у самай цемры. Асабліва раз на год – калі ноч самая чорная, калі зорак не бачна. Колькі гадоў ужо шукаю. Усяго пабачыў за гэты час. Цемру праходзіў, крочыў далей да Святла, а кветкі ўсе ж такі няма».

Чалавек сядзеў і, усміхаючыся, размаўляў з самім сабою. Крыўды, злосці, раздражнення ў яго не было. Ён проста хацеў знайсці тое, што, напэўна, рана ці позна шукае кожны ў сваім жыцці.

Чалавек хацеў знайсці сваю Папараць-Кветку, таму ішоў, падаў і зноў падымаўся...

Ён не лічыў дні. Хіба гэта важнейшае за тое, што шукаеш? Ён хацеў знайсці патрэбнае...

Калі ідзеш – абавязкова знойдзеш. Часам неспадзявана, часам зусім не там, дзе думаў сустрэць, але знойдзеш...

Чалавек сядзеў, усёй сваёй істотай адчуваючы Зямлю і Неба. Не трэба ведаць іншую мову каб зразумець гэта, трэба толькі прыслухацца.

Нават цемра не стамляла яго: ён ведаў – прыйдзе Дзень. Цемра цяжкая тым, хто яе баіцца.

Як звычайнае і даўно вядомае прыйшло да яго разуменне, што Папараць-Кветка – Кветка-Цуд, Кветка-Таямнічасць – зусім побач.

Яе больш не трэба шукаць. Яна – яркая, прыгожая, жыве ў ім самім. Заўсёды... З самага пачатку... Саграваючы сваёй цеплынёй ўвесь час. Які ў яе колер? Які ты сам уяўляеш... «Сваё багацце я заўседы насіў у сабе», – засмяяўся Чалавек.

Ён раскажа пра гэта тым, хто таксама шукае. «Шчасце ў нас саміх! Самае каштоўнае – у нас саміх. Кожны нясе ў сабе сваю Папараць-Кветку, і знікнуць яна не можа! – усміхнуўся – Так проста...»

Так проста ён зразумеў гэта...





# Птушка
# і Край Неба

Птушка хацела знайсці Край Неба...

Колькі разоў яна пыталася ў іншых птушак, дзе ён, але ніхто не ведаў. «Навошта ён табе?» – чула ў адказ і ёй станавілася так няёмка, быццам яна хацела спазнаць тое, што нікому ведаць не трэба.

Нарэшце, саму сябе спытаць, чаму яна так балюча хоча гэта спазнаць, Птушка не магла. Таму, аднойчы ўзляцеўшы ў паветра, яна зразумела, што менавіта сёння пачне шукаць той Край Неба.

Развітаўшыся з сяброўкамі, паднялася ў вышыню і хутка знікла ў сіняватай смузе, што вышэй за ўсе аблокі на Небе. Хутка зніклі і размовы пра яе, толькі зрэдку вяртлявая Сойка павучала сваіх дзетак: «Не паглядайце так доўга ў Неба! Не трэба... Глядзіце ніжэй, туды, дзе ёсць ежа».

Прайшло шмат часу, але Птушкі ўсе не было. Дзе яна і што з ёй, не ведаў нават Вецер...

А Птушка тым часам шукала адказ на сваё пытанне, да знямогласці ўсе ляцела і ляцела... па-над незлічонай колькасцю азёр, палёў, рэк, лясоў. Яны змяняліся, быццам малюнкі, што складаюцца ў калейдаскопе з адных і тых жа частак, але кожны раз па-рознаму.

Птушка ляцела, зрэдку спынялася, распраўляла стомленыя крылы, дазволіўшы сабе крыху адпачыць і паслухаць гукі Зямлі, якія за час вандроўкі сталі зусім нязвыклымі, нават чужымі.

Надзіва, адчаю ў гэтых, пакуль безвыніковых, пошуках у яе не было. Проста паступова прыходзіла разуменне, таямнічае і вельмі моцнае адчуванне таго, што усё існуючае вакол цябе канца не мае. І менавіта гэта натхняла яе, надавала сілы ляцець далей. Навошта? Напэўна, каб цяпер спазнаць саму сябе, каб зразумець сэнс свайго існавання.

Вандроўка змяніла яе... Яна стала амаль белая, нават сівая.

Ад доўгай дарогі канцы крылаў счарнелі, а дзюба і ногі ад ветру, холаду ды спекі так і засталіся чырвонымі. А Птушка ўсе шукала і ўжо, разумеючы, што наўрад ці знойдзе, спыніцца не магла...

Вялікі цікавы Свет задае нечаканыя пытанні тым, хто жыве ў ім неабыякава, каб потым, бачачы іхнія пошукі, гэтак жа неспадзявана дапамагчы з адказам. Здаецца, доўгія разважанні з самім сабою, пакуты ў вызначэнні свайго шляху будуць цягнуцца бясконца. Але надыходзіць пэўная хвіліна і, нібы цуд, бліскуча, раптам знаходзіцца адказ на тое, што турбавала столькі часу.

Сустрэча... Чысты позірк, словы, усмешка і прыходзіць адчуванне палёгкі. Быццам глыток свежага паветру, прыходзіць разуменне ўсяго існавання, як з'явы... – непаўторнай, адзінай, свабоднай. Хіба штосьці ў гэткім Свеце можа мець канец? Ёсць толькі працяг – вось і ўсё...

Птушка, нарэшце, спынілася... Не ад стомленасці, не ад адчаю: пад сваімі белымі крыламі за час вандроўкі яна бачыла шмат чаго... Яна спынілася ад захаплення Прыгажосцю...

Прыгажосць глядзелася ў блакітныя азёры, перабірала ветрам лясы, лашчыла кветкі, слухала спевы сваёй Зямлі. Ляцець далей не хацелася... Ды і навошта ляцець, калі Неба не мае краю, а Свет – бясконцы?

Яна склала свае крылы і азірнулася... Птушцы было добра бачна ўсе навокал. Ей падабалася стаяць высока. Птушка не хвалявалася, што зусім побач жывуць людзі – у час доўгай вандроўкі яна згубіла страх... Вось толькі звычка падымаць па чарзе ногі, каб хутчэй адпачыць і ляцець далей, захавалася, ды голас у дарозе знік...

«Як тут цудоўна!» – падумала Птушка. – Здаецца, я яшчэ нідзе гэткую Прыгажосць не бачыла... Застануся тут назаўсёды» – вырашила яна і ўздыхнула з палёгкай...

«Глядзіце, глядзіце! Птушка вярнулася!» – загаманілі ўнізе нечыя галасы. Птушка ўбачыла сярод зарасляў трыснягу качак. «А яшчэ Сойка ўчора казала, што яна ніколі не вернецца дамоў...» – працягвалі гаманіць яны, усім сваім выглядам паказваючы, што па-іншаму ніколі і быць не магло.

Птушка ўзняла галаву і паглядзела на Сонца, што ўжо садзілася за возера, надаючы яму ружовы колер, і раптам зразумела, што той Край, які яна так доўга шукала, зусім побач ! Ён заўседы быў там, адкуль яна сама.

Ёй стала так хораша, быццам не было доўгага часу цяжкай вандроўкі якая, напэўна, і бывае патрэбна, каб гэта зразумець...





# Пасадзіла Жанчына Насенне

Пасадзіла Жанчына Насенне...

Зямлю рукой пагладзіла. Усміхнулася. На Сонейка паглядзела.

Незвычайнае тое Насенне ў Жанчыны... Вырастае з яго толькі тое, пра што марыш. Шмат хто садзіў яго, але не ў кожнага нават парасткі з'яўляліся. Кажуць, калі думкі светлыя, тое Насенне прарастае хутка і потым не звяне ўжо ніколі...

Пасадзіла Жанчына Насенне... Агледзелася – шмат чаго ўбачыла... Задумалася... Успомніла нешта сваё патаёмнае...

Цёплыя далоні ў Жанчыны, ласкавыя... Здаецца, няшмат часу прайшло: з'явілася танюткая Сцяблінка. Цягнецца ў вышыню да Святла... Колькі сілы ў яе! Можа, Сонейка або думкі Жанчыны дапамагаюць?

Расце Сцяблінка. Хутка расце. Разгарнуўся першы лісток. Маленькі, сціплы пакуль яшчэ. Глядзіць на яго Жанчына – радуецца... «Вось і з'явілася мая Вера, – думае. – Вера ў тое, што ў кожным на Зямлі светлае заўсёды ёсць». Расце Сцяблінка – дужэе яе Вера...

Бачыць Жанчына: наступны лісток да Сонейка пацягнуўся... Прыгожы які! Напэўна Вера дапамагае: хутка расце той другі лісток! Глядзіць на яго Жанчына – радуецца... «Вось і Надзея мая з'явілася, – думае. – Надзея на тое, што добрае ніколі на Зямлі не знікне».

Расце Сцяблінка... Гойдае Сцяблінку ветрык, быццам люляе. Ціхім шэптам ёй нешта расказвае. Напэўна, пра тое, як яна ўсім на Зямлі патрэбна. Ужо не пазнаць таго сціплага парастка...

Яшчэ адзін лісток на Сонейку заблішчэў... Той трэці лісток абодва першыя падтрымалі! «Вось і Любоў мая з'явілася, – думае Жанчына. – Любоў да тых, хто на Зямлі жыве». Гладзіць пяшчотна лісткі, радуецца, на Сцяблінку гледзячы, дзякуе Насенню, Зямлі за гэткую прыгажосць.

Пасадзіла Жанчына Насенне...

Колькі часу прайшло. Не знікла тая Сцяблінка, ды і не знікне ніколі! Цягнецца яна да Святла! Танюткая, але дужая...

Блішчаць на Сонейку яе лісцікі – Вера, Надзея, Любоў – так на Зямлі патрэбныя... Радуюць усіх прыгажосцю сваёй...





# Жыве на Свеце Шчасце

Жыве на Свеце Шчасце...

У якім месцы? Невядома. Але што ёсць яно – ведаюць усе. Кажуць, што прыходзіць Шчасце абавязкова да кожнага, хоць аднойчы ў жыцці...

Села на ўскраек акенца маленькай шэрай птушкай... Крылы склала, чакала пакуль нехта прыйдзе. Шмат часу прайшло – так і не заўважыў ніхто. Далей паляцела...

Да іншых завітала, пагукала. Падышлі да яе, запыталіся: «Што трэба?» «Шчасце я...» – адказала ледзь чутна.

«Хіба ты можашь быць Шчасцем? – здзівіліся. – Шчасце вялікае, бліскучае – яго здалёк бачна. А ты – маленькае, непрыкметнае. Ляці куды хочаш!»

Узнялося Шчасце ў Неба і паляцела зноў далей. У іншым акенцы святло ўбачыла, зазірнула: «Можа, вам Шчасце патрэбна?» – спытала.

Там доўга думалі, разважалі, куды яго дзець, ці патрэбна яно... «Прабач, не да цябе нам зараз, клопатаў незлічона. Ляці далей!» – і акенца зачынілі. Паляцела...

Доўга лятала...

«Няўжо я так нікому і непатрэбнае?» – думае. Спынілася вадзіцы папіць каля крынічкі. У ваду паглядзела – сябе ўбачыла. «Хіба хто гэткую заўважыць?» – уздыхнула... і зноў паляцела...

Села на ўскраек акенца маленькай шэрай птушкай. Крылы склала... Толькі разочак гукнула ціхенька. Стамілася, вочы прыкрыла.

Цёплымі далонямі асцярожна пагладзілі яе... «Чаго ты, Шчасцейка, засумавала?» – спыталі.

Адкрыла Шчасце вочы, усміхнулася радасна: «Як мяне пазналі? Я ж з выгляду – непрыкметнае...»

У адказ пачула: «Дзякуй, што завітала! Як жа цябе не пазнаць? Сапраўднае заўсёды бачна... А тое, што яркіх фарбаў ды бляску няма – дык навошта Шчасце ўпрыгожваць?»

Засмяялася Шчасце! Званочкамі срэбранымі заспявала... Раскінула крылы над тымі, хто яго пазнаў...

Доўга гасцявала Шчасцейка, але трэба зноў у дарогу – колькі яшчэ акенцаў наперадзе... Не развітвалася – навошта? Пакінула свае часцінкі россыпам Кахання, Дабрыні, Пяшчоты... Колерамі вясёлкавымі ззяюць яны ў сэрцах і зараз... Светла ад іх, таму і берагуць...

Жыве на Свеце Шчасце...

У якім месцы? Невядома. Але тое, што ёсць яно, ведаюць усе... Кажуць, што прыходзіць Шчасце абавязкова да кожнага, хоць аднойчы ў жыцці...



*Жыве на Свеце Шчасце.*
*Дзе? Невядома... Але, усё ж такі,*
*яно жыве там, дзе жывем мы...*

*У нас адзін вялікі Дом...*
*У ім няма сцен, дзвярэй, вакон.*
*Затое ў ім ёсць:*
*Неба, Сонейка, Вада, Глеба...*

*Колькі ў нашым Доме жыхароў!*
*Вялікіх і не вельмі...*
*Мы ўсе жывем разам!*

*Мы звязаны паміж сабою тонкімі нябачнымі стужкамі.*
*Мы жывем у адным Доме, назва якому – Зямля.*
*Азірніся...*
*Які ён прыгожы, наш Дом!*

У кожнага з нас свая гісторыя жыцця і свая мудрасць.
Кожны з нас унікальны і мае каштоўнасць і сілу
дзівоснага бязмежнага унутранага свету.
Наш шчаслівейшы свет ствараецца кожным з нас
у кожнам Шчаслівым Доме.

У нас ёсць адно месца нараджэння – Зямля
У нас адна раса – Чалавек
У нас адна сіла – Любоў

З любоўю,
Вольга Верасень

www.olgaverasen.com



9 780999 577905